КАШАПАРАЎ ПРА АДЗІНУЮ ЖОНКУ

Сямейная плошча

ВАКОЛ СВЕТУ З ДРЭННЫМ ЗРОКАМ

Сямейная плошча

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ВЕРАСНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 173 (29040)

ЦЫТАТА ДНЯ

Людміла КАНАНОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў:

«У пачатку гэтага года доля грамадзян ва ўзросце 60 гадоў і больш у агульнай колькасці насельніцтва Беларусі склала каля 22 %, да 2025 года гэты паказчык узросце да 28 %. У сувязі з гэтым была пачата распрацоўка праекта нацыянальнай стратэгіі ў інтарэсах пажылых грамадзян, які будзе прадстаўлены на абмеркаванне ў кастрычніку—лістападзе. Сярод прапаноў у праект з боку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — выкарыстанне механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы аказання медыцынскіх і сацыяльных паслуг для грамадзян сталага веку, падтрымка навуковых даследаванняў у галіне геранталогіі, укараненне ў навучальныя праграмы для моладзі курсаў па планаванні актыўнага даўгалецця. Разглядаліся таксама варыянты прыцягнення камерцыйных і некамерцыйных сетак для дастаўкі прадуктаў, аказання транспартных і бытавых паслуг па прынцыпе сацыяльнага прадпрымальніцтва».

УРАДЖАЙНАЕ СЭЛФІ

Фота БелТА.

Сёлета студэнты Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны выехалі не «на бульбу», а «на буракі». Менавіта гэтыя караняплоды яны дапамагаюць убіраць у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Альгоўскае». Ураджай сталовых буракоў сёлета багаты — толькі за першы дзень работы хлопцы і дзяўчаты са студэнцкага дэсанта сабралі 55 тон. З такімі і сэлфі зрабіць не сорамна, лічаць Яна КАРОТКАЯ, Іна СТРАПКО і Наталля ЖЫЖКЕВІЧ.

Харчовая бяспека

БУЛЬБАЧКА ЎРАДЗІЛА,

ды і яблыкаў з цыбуляй хопіць усім

Фота БелТА.

Каб пазбегнуць перавытворчасці, прыватнікам рэкамендуюць аб'ядноўвацца ў асацыяцыі.

Сярэдняя ўраджайнасць «другога хлеба» — 365 цэнтнераў з гектара. Пакуль...

Верасень традыцыйна лічыўся ў нас (тых, каму цяпер за 45—50) месяцам бульбы. Яе капалі школьнікі і студэнты, замест таго каб сядзець у класах ці аўдыторыях. Цяпер кожны займаецца сваёй справай. А ўраджайнасць бульбы сёлета вышэйшая за леташнюю нязначна — на 11 %, але ўсё ж...

СТАР. 4

Наш праект

Конкурс апавяданняў «Звязды»: падводзім вынікі...

Абвяшчаем новы этап

Ужо шмат гадоў наша газета вядзе адмысловы творчы праект — конкурс апавяданняў, у якім па добрай традыцыі адточваюць пяро як маладыя, так і сталыя аўтары незалежна ад месца пражывання, літаратурнага вопыту і сукупнасці заслуг. Кожны твор, які друкуецца на старонках «Звязды», чымсьці адметны і цікавы, а часам і наватарскі. А галоўнае, спадзяёмся, кожны з іх не толькі прыносіць вопыт прыгожага пісьменства аўтару, але і знаходзіць свайго чытача.

Выбіраць найлепшых у творчым спаборніцтве заўсёды цяжка, але неабходна. Сёлета ў вызначэнні пераможцаў зноў працавала кампетэнтнае журы, у склад якога ўвайшлі, у прыватнасці, вядучы конкурсу Алесь Бадак, а таксама галоўныя рэдактары літаратурна-мастацкіх выданняў Віцебскага дома «Звязда».

СТАР. 13

КАРАТКА

• У Аршанскім раёне да канца гэтага года плануюць увесці ў эксплуатацыю буйны малочнатаварны комплекс «Купалінка».

• **16 жыхароў Мінска старэйшыя за 90 гадоў афіцыйна працуюць, усяго ў сталіцы зарэгістраваныя 169 тысяч працаўладкаваных пенсіянераў.**

• Пасажырапаток у Нацыянальным аэрапорце Мінск у студзені — жніўні 2019 года павялічыўся амаль на 12 % у параўнанні з леташнім.

• **Карціну даўжынёй 250 метраў мастакі падараць Гродна да Дня горада. Палатном стане праезная частка.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

У ЧАСЫ НЕСТАБІЛЬНАСЦІ ВАЖНА СУСТРАКАЦЦА

Такую думку выказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы са старшынёй парламенцкай камісіі Турцыі па замежных справах Валканам БАЗКЫРАМ.

Гэта першы візіт профільнай камісіі Вялікага нацыянальнага сходу Турэцкай Рэспублікі ў Беларусь. Акрамя старшыні, у дэлегацыю ўвайшлі яшчэ пяць яе членаў, а таксама дарадца і супрацоўнік парламенцкай камісіі.

— Беларусь і Турцыя — дзве сяброўскія краіны, — сказаў, вітаючы госця, Уладзімір Андрэйчанка. — Турцыя — адна з першых краін, якая прызнала незалежнасць Рэспублікі Беларусь. Адразу ж быў прызначаны пасол Турцыі. Прыемна і тое, што ўсе гэтыя гады нашы адносіны развіваюцца паступальна, і гэта развіццё ніколі не спынялася.

Спікер ніжняй палаты беларускага парламента адзначыў ролю ў гэтым кіраўнікоў дзяржаў, паміж якімі ўсталяваліся цёплыя сяброўскія адносіны. «Таму ў нас няма на сённяшні дзень нейкіх праблемных пытанняў», — заўважыў ён.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў дадаў, што двухбаковыя адносіны развіваюцца не толькі ў палітычнай сферы, але і ў гандлёва-эканамічнай, культурнай, навуковай, інвестыцыйнай. Краіны актыўна ўзаемадзейнічаюць у міжнародных арганізацыях, дзе аказваюць адна адной падтрымку.

Па выніках мінулага года тавараабарот паміж Беларуссю і Турцыяй дасягнуў мільярда долараў. Уладзімір Андрэйчанка нагадаў, што прэзідэнты дзвюх краін паставілі задачу перад сваімі ўрадамі дасягнуць тавараабароту ў паўтара мільярда. Ён выказаў меркаванне, што для вырашэння гэтай задачы, а таксама для нарошчвання інвестыцыйнага супрацоўніцтва павінны падключыцца і парламентарыі.

Спікер падкрэсліў, што адносіны паміж заканадаўчымі органамі Беларусі і Турцыі склаліся вельмі добрыя. Летась было падпісана адпаведнае пагадненне аб супрацоўніцтве, у парламентах маюцца групы дружбы. Уладзімір Андрэйчанка падзякаваў турэцкаму боку за ўдзел у міжнароднай канферэнцыі Групы падтрымкі Шаўковага шляху Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якая праходзіла ў Мінску.

— Час зараз вельмі няпросты, неспакойны, я сказаў бы нават, выбухованебяспечны, таму вельмі важна на такім узроўні сустракацца, абмяркоўваць, каардынаваць нашу работу, і напэўна, самае галоўнае — працаваць на апярэджанне, — сказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Таму візіт ваш вельмі важны.

Валкан Базкыр перадаў ад спікера Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі Мустафы Шантопа прывітанне і запрашэнне свайму беларускаму калегу наведаць Турцыю з афіцыйным візітам.

— Беларусь для Турцыі вельмі важная сяброўская краіна не толькі ў плане гандлёва-эканамічных адносін, а таксама і ў частцы палітычнага ўзаемадзеяння, — запэўніў Валкан Базкыр. — У гэтай няпростай геаграфіі Беларусь успрымаецца намі як востраў бяспекі. Мы жадаем развіваць супрацоўніцтва як на міжнароднай платформе, так і ў двухбаковым фармаце.

Што датычыцца мэты дасягнуць тавараабароту ў паўтара мільярда долараў, турэцкі парламентарый лічыць яе не проста дасягальнай, але ён упэўнены, што патэнцыял у краін нашмат вышэйшы.

На тэрыторыі Беларусі працуе 50 турэцкіх кампаній, інвестыцыі якіх на цяперашні момант складаюць паўтара мільярда долараў. Самым буйным інвестарам з'яўляецца тэлекамунікацыйная кампанія Turkcell.

Валкан Базкыр агучыў пажаданні аб наладжванні прамых кантактаў паміж парламенцкімі камісіямі як у міжнароднай сферы, так і ў сферы энергетыкі, адукацыі і культуры. Ён паведаміў пра планы ў супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і турэцкім Саветам па навуковых даследаваннях.

— Мы таксама знайшлі досыць цікавым праект транспартных зносін па рацэ Дняпро, і нашы дзелавыя колы прапрацоўваюць яго, — паведаміў турэцкі палітык. — Пасля аналізу яго рэнтабельнасці і пры ўмове, што Украіна таксама будзе зацікаўлена, мы спадзяёмся, што нам удасца зноў зрабіць Дняпро значным элементам міжнародных грузаперавозак.

Старшыня парламенцкай камісіі Турцыі дадаў, што яго краіна надае вялікае значэнне таксама супрацоўніцтву паміж ВНУ дзвюх краін, і ў гэтай сувязі чакаецца візіт у Беларусь дэлегацыі Савета па вышэйшай адукацыі Турцыі.

Кіраўнік парламенцкай дэлегацыі Турцыі выказаў надзею і на тое, што ўдасца вызначыць магчымасць для вытворчасці тэхнікі БелАЗ у яго краіне.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Перапіс

КОЛЬКІ ЯБЛЫНЬ І КУСТОЎ НА ДАЧЫ?..

Работнікі Белстата просяць паставіцца да такіх пытанняў дастаткова сур'ёзна

Як вядома, з 4 да 30 кастрычніка ў нас у краіне будзе праходзіць перапіс насельніцтва пад лозунгам «Погляд у сучаснасць — крок у будучыню». Перапісацца можна будзе адным з трох спосабаў: самастойна і ў зручны час запоўніць апытальныя лісты праз інтэрнэт, на стацыянарных участках, у сябе дома падчас вуснага апытання перапісчыка.

Насельніцтву прапануюць адказаць на 49 пытанняў. Гэтым разам, у нас будуць пытацца аб асноўных дэмаграфічных і нацыянальна-этнічных характарыстыках, міграцыйнай актыўнасці і адукацыі. Пацікавяцца таксама крыніцай існавання, занятасцю, колькасцю дзяцей, жыллёвымі ўмовамі і гаспадарчай дзейнасцю.

Упершыню ў перапісе будзе асобны блок пытанняў, які тэматычна звязаны з сельскай гаспадаркай. Гэтыя даныя неабходныя для вызначэння аб'ёмаў вырабленай насельніцтвам прадукцыі і ацэнкі забеспячэння харчовай бяспекі краіны, растлумачыла **старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА** на прэс-канферэнцыі ў прэс-цэнтры БелТА.

Гэты блок змяшчае пытанні не толькі пра тое, якія аб'ёмы бульбы, яблыкаў, груш і іншых плодаагароднінных культур вырошчвае рэспандэнт на сваім участку, але і пра тое, якая жыўнасць маецца ў гаспадарцы: каровы, свінні, авечкі, куры і нават страусы. Іна Мядзведзева растлумачыла, што не трэба баяцца гэтых пытанняў і варта сумленна на іх адказваць. Яна запэўніла, што гэтыя звесткі патрэбныя для макраэканамічнага планавання, а не для ўвядзення нейкіх міфічных падаткаў на пладовыя дрэвы або на падсвінкаў.

Адзначаецца таксама, што асабістая інфармацыя грамадзян будзе абаронена аператыўна-аналітычным цэнтрам і кампаніямі ПВТ: звесткі паступяць на закрыты сервер Белстата ў зашыфраваным выглядзе. Ніякая падатковая, ці іншы орган улады, персаналізаваную інфармацыю пра гэта ніколі не атрымае.

Першую інфармацыю аб колькасці насельніцтва Белстат падасць у лютым 2020 года. Плануецца, што асноўныя даныя перапісу насельніцтва будуць прааналізаваныя да ліпеня наступнага года, у тым ліку разгорнутая інфармацыя па сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыках і фактычным беспрацоўі. А інфармацыю па самай складанай частцы апытальніка — дзейнасці насельніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі, спецыялісты атрымаюць у ліпені 2021 года.

Сяргей КУРКАЧ.

Сацыяльны клопат

ЧЫСТАЯ ВАДА — ДЛЯ ХВАРОБЫ БЯДА

Фота БелТА.

У 6.15 будзе пачынацца работа басейна ў Мазыры, які пасля трохгадовай рэканструкцыі зноў прымае аматараў фізкультуры і спорту. За год яго змогуць наведаць 150 тысяч чалавек.

У гэты аб'ект укладзена амаль сем мільёнаў рублёў. Ён пабудаваны за сродкі абласнога і раённага бюджэтаў, а таксама грошы, зароблены на суботніках. Гэты спартыўны комплекс адносіцца да спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 2. Тут за чвэрць стагоддзя было падрыхтавана шэсць майстроў спорту, 19 кандыдатаў у майстры спорту і 124 спартсмены-першаразраднікі.

Для аматараў плавання абноўленыя вялікая і малая чашы, трэнажорная зала, а таксама зроблены камфортныя душавыя і раздзявальні. Ёсць прыстасаванні для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У спартыўным комплексе арганізаваны таксама і заняткі аддзяленняў філіяла абласнога вучылішча алімпійскага рэзерву, Мазырскай СДЮШАР прафсаюзаў па веславанні на байдарках і каноэ. Сёння сюды прыходзяць вучыцца плаваць школьнікі, а таксама арганізаваны платныя групы па акваэробіцы, більярдзе, настольным тэнісе. Да канца года адкрыюцца дзве залы — для барцоў і гульнявая. У басейне будзе працаваць фітабар, дзе прапануюць лекавыя гарбаты і кіслародныя кактэйлі. Па словах **старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя САЛАЎЁ**, які прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця, у апошнія гады на Гомельшчыне вельмі шмат зроблена для развіцця спорту:

— Басейн у Мазыры — яшчэ адзін знакавы аб'ект нароўні з ужо адкрытай лыжароллернай трасай і футбольным манежам, які будуецца ў Гомелі. Новае збудаванне ў Мазыры пашырыць магчымасці для заняткаў спортам усіх аматараў.

Між тым у Лоеве пасля рамонту адкрыта лазня. Будынак на вуліцы Барыса Царыкава набыў зусім новы выгляд. Сродкі, зароблены на суботніках жыхарамі раёна і гарадскога пасёлка, былі накіраваны на набыццё матэрыялаў для важнай грамадскай установы. Рамонтныя работы КЖУП «Лоеўскі райжылкамгас» ажыццяўляла гаспадарчым спосабам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Японіі змяніўся ўрад

Імператар Японіі Нарухіта афіцыйна зацвердзіў склад новага ўрада краіны, які яму прадставіў прэм'ер-міністр Сіндза Абэ. Урачыстая цырымонія з гэтай нагоды прайшла ў імператарскім палацы ў Токіа, абвясціла кіраўніцтва справамі японскага імператарскага двара. Як адзначаюць аналітыкі, Сіндза Абэ правёў самыя маштабныя з 2012 года перастаноўкі ва ўрадзе краіны. Усяго прэм'ер змяніў кіраўнікоў 13 ведамстваў, уключаючы МЗС, міністэрствы абароны, юстыцыі, міністэрства эканомікі, гандлю і прамысловасці краіны. Свае пазіцыі захавалі толькі двое — міністр фінансаў Тара Аса і генеральны сакратар кабінета міністраў Ёсіхідэ Суга, якія нязменна ўваходзілі ў склад урада Абэ з моманту яго прыходу да ўлады ў снежні 2012 года. Нягледзячы на маштабныя змены, прэм'ер адзначыў, што імкнецца захаваць стабільнасць ўнутры Кабміна і быць гатовым да новых выклікаў.

У Іраку больш за 30 чалавек загінулі ў цісканіне

Больш за 30 чалавек сталі ахвярамі цісканіны, якая ўзнікла ў горадзе Кербела на поўдні Ірака. Гэта адбылося падчас рэлігійнага мусульманскага свята Ашура, перадае іракскі інфармацыйны партал «Ат-Тагір». Паводле звестак мясцовых улад, звыш сотні чалавек атрымалі траўмы, некаторыя пацярпелыя — у крытычным стане. Цісканіна ўзнікла ў канцы працэсіі, пасля таго як тысячы паломнікаў кінуліся да мячэці. Штогод у Кербелу прыязджаюць мільёны паломнікаў. Шыіты адзначаюць Ашура як жалобу па ўнуку прарока Мухамеда імаме Хусейне, які загінуў і пахаваны ў Кербеле. Па традыцыі ў гэты дзень пілігрымы праходзяць па вуліцы, якая вядзе да мячэці імама Хусейна.

«Айфон» узростам 2100 гадоў адкапалі ў Тыве

Пахаванне жанчыны са старажытнага качавога народа хуну выявілі сярод іншых пахаванняў на востраве ў так званым Саянскім моры ў Тыве. Больш за ўсё ўвагу археолагаў прыцягнула незвычайная спражка ад рэменя памерлай, вельмі падобная на сучасны смартфон. Навукоўцам удалося вызначыць прыкладны ўзрост пахавання дзякуючы кітайскім манетам, якімі калісьці ўпрыгожылі рэмень жанчыны: яны былі адчаканены 2137 гадоў таму. «Нам неверагодна пашанцавала знайсці пахаванні багатых качэўнікаў, якія не пацярпелі ад дзеянняў старажытных раскрадальнікаў магіл», — падкрэсліла начальнік Тывінскай археалагічнай экспедыцыі Марына Кілуноўская, словы якой прыводзіць Siberian Times. Археолагі працягваюць работу на некропалі Ала-тэй, тэрыторыя якога паказваецца над паверхняй Саяна-Шушанскага вадасховішча толькі на некалькі тыдняў у год — у маі і чэрвені.

Лёгкая атлетыка

МІНСК ЗАСЛУГОЎВАЕ ПРЫНЯЦЬ ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

Так лічаць удзельнікі лёгкаатлетычнага матча Еўропа — ЗША

У аўторак завяршыўся лёгкаатлетычны матч Еўропа — ЗША, які праходзіў на мінскім стадыёне «Дынама». Перамогу ў ім атрымалі еўрапейскія спартсмены, па выніках 37 відаў яны набралі 724,5 бала, у прадстаўнікоў ЗША — 601,5 бала.

У другі дзень спаборніцтваў пераможніцай у скачках у даўжыню стала беларуска Анастасія Мірончык-Іванова. Яе вынік — 6 м 74 см, 1 см саступіла нашай спартсменцы ўкраінская скакуха Марына Бех-Раманчук, трэцяе месца ў алімпійскай чэмпіёнкі з ЗША Брытні Рыз.

«Вялікі дзякуй нашым балельшчыкам за падараныя эмоцыі. Такая публіка, аж да мурашак па скуры. Беларусы ўмеюць падтрымаць: усё роўна, наш спартсмен ці амерыканскі. Яны давалі нам пазітыўныя эмоцыі, што адбілася на выніку. Акрамя таго, хочацца падзякаваць сапернiцам за вельмі высокі ўзровень канкурэнцыі. Дзякуючы гэтаму выйграны не толькі матч, але і першы старт за доўгі час. Гэта матывуе напярэдадні чэмпіянату свету. Варта, вядома, папрацаваць, бо сваім вынікам я не вельмі задаволеная», — прызналася наша спартсменка.

Яшчэ адна наша лёгкаатлетка Ганна Малышчык стала другой у спаборніцтвах па кіданні молата. У сваёй найлепшай спробе яна паслала снарад на 72 м 70 см. Пасля завяршэння спаборніцтваў Ганна адзначыла, што сёння разлічвала паказаць лепшы вынік, але, на жаль, не атрымалася парадаваць сваіх балельшчыкаў перамогай. Цяпер трэба працягваць падрыхтоўку да галоўнага турніру сезона — чэмпіянату свету.

Трэцяе месца ў бегу на 100 м з бар'ерамі заняла наша Эльвіра Герман. Яна засталася засмучаная сваім выступленнем і адзначыла, што не атрымалася паказаць тое, чаго чакала ад сябе. «Гэта вельмі адказна — прадстаўляць каманду Еўропы. Цудоўна, што атлеты сусветнага ўзроўню прыехалі ў родную краіну. Дзякуючы правядзенню спартыўных спаборніцтваў пра Беларусь больш давядаюцца ў свеце», — дадала спартсменка.

Пасля завяршэння лёгкаатлетычнага матча Еўропа — ЗША на стадыёне «Дынама» прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання. Кубак пераможцам з каманды Еўропы перадаў міністр спорту і турызму Беларусі Сяргей Кавальчук. Удзел у цырымоніі ўзнагароджання таксама прынялі прэзідэнт Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Свен Арнэ Хансен і старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі. Апошні адзначыў, што лёгкаатлетычны матч Еўропа — ЗША стаў двухдзённым святам для аматараў спорту. «Тое, што адбылося ўчора і сёння — сапраўднае свята спорту. Варта было паглядзець на балельшчыкаў, якія давалі «пяць» праходзячым міма лёгкаатлетам. Гэта было вельмі эмацыянальна. На працягу ўсяго матча захоўваўся напал пачуццяў, вялася цікавая і напружаная барацьба», — сказаў Дзевятоўскі.

Анастасія МІРОНЧЫК-ІВАНОВА.

У праграму гістарычнага матча былі ўключаныя такія віды лёгкай атлетыкі як кіданне молата, кіданне кап'я, кіданне дыска, бег на 100 м, 100 м з бар'ерамі, 110 м з бар'ерамі, 200 м, 400 м, 400 м з бар'ерамі, 800 м, 1500 м, 3000 м, 3000 м з перашкодамі, эстафетны бег 4х100 м, змешаная эстафета (200-200-400-800 м), штурханне ядра, трайны скачок, скачкі ў вышыню, у даўжыню, з шастом.

Удзел у матчы прыняло каля 350 атлетаў, 14 беларусаў увайшлі ў склад каманды Еўропы. У кожным відзе праграмы выступалі па восем спартсменаў (па чатыры прадстаўнікі ад Еўропы і ЗША). Пераможцы атрымаюць па 7 тысяч еўра прызавых, удзельнікі, якія занялі другія месцы, — па 5 тысяч, трэція месцы — па 4 тысячы еўра.

Гавораць удзельнікі.

Арланда Артэга (Іспанія):

— Я ўпершыню ў Беларусі і вельмі кануты прыёмам балельшчыкаў на стадыёне. Мне вельмі спадабалася ідэя ўдзельнічаць у матчавай сустрэчы, і цяпер магу сказаць, што не шкадую аб сваім прыездзе ў вашу краіну. У Мінску вельмі выдатна! Класны стадыён, цудоўная публіка. Выдатнае пакрыццё бегавых дарожак, дзе лёгка паказаць першакласны вынік.

Пётр Малахоўскі (Польшча):

— Такія спаборніцтвы, як лёгкаатлетычны матч у Мінску, павінны праходзіць часцей, бо гэта выдатная рэклама лёгкай атлетыкі. Вельмі падрыхтаваныя спаборніцтвы: усё прадумана да дробязяў, спагадлівыя валанцёры і прадстаўнікі аргкамітэта. У Мінску сапраўды адчуваю сябе вельмі добра. Я ўпершыню ў Беларусі, сталіца вашай краіны мне вельмі падабаецца.

Раміль Гуліеў (Турцыя):

— Цяпер у лёгкаатлетаў ідзе падрыхтоўка да чэмпіянату свету, і гэты старт — добрая магчымасць праверыць свае сілы, прайсціся па тактыцы бегу. Хораша, што колькасць людзей, якія цікавяцца спортам, у вашай краіне, павялічваецца. Я спадзяюся, што гэта не апошні буйны турнір у Беларусі. Было б выдатна ў Мінску правесці чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы.

Іван КУПАРВАС.
Фота БелТА.

Камандны чэмпіянат Еўропы па шашках-100

З 2 да 8 верасня 2019 года ў К'янчана — Тэрме (Італія) праходзіў камандны чэмпіянат Еўропы па шашках-100 сярод мужчын і жанчын.

У праграме чэмпіянату ўсе спартсмены спаборнічалі ў хуткіх шашках, вокамгненнай і класічнай гульні. У гэтым камандным чэмпіянаце прымалі ўдзел каманды шашыстаў і шашыстак з Бельгіі, Беларусі, Італіі, Нідэрландаў, Польшчы, Украіны, Расіі і Чэхіі. За медалі змагаліся практычна ўсе наймацнейшыя на сённяшні дзень спартсмены! Нашу краіну прадстаўлялі дзве каманды: мужчынская ў складзе сталічных міжнародных гросмайстраў Яўгена Ватуціна і Аляксандра Булатава, а таксама міжнароднага майстра Аляксея Куніцы, і жаночая каманда ў складзе міжнароднага гросмайстра Вольгі Федаровіч і міжнароднага майстра Паліны Петрусёвай (абедзве спартсменкі сталічныя).

4 і 5 верасня прайшлі спаборніцтвы ў хуткай гульні (рапідзе) і ў вокамгненнай гульні (бліцы), дзе абедзве нашы зборныя каманды заваявалі сярэбраныя медалі. Жаночая каманда стала сярэбраным прызёрам у хуткай і вокамгненнай гульні, а таксама трэцяй у класічнай праграме. Мужчынская ж наша каманда стала сярэбраным прызёрам у хуткіх шашках (рапідзе) і бронзавым прызёрам у асноўнай класічнай праграме.

У цэлым выступленне абедзвюх нашых камандаў можна лічыць паспяховым, бо за медалі змагаліся моцныя еўрапейскія каманды шашыстаў, у першую чаргу каманды з Расіі і Нідэрландаў, Украіны і Італіі — заканадаўцы моды ў шашачным спорце. І ўсё ж мы, беларусы, выступілі годна, і гэта выдатна. Віншуем нашых спартсменаў і іх трэнераў з паспяховым выступленнем на чэмпіянаце Еўропы ў Італіі!

Яўген САЛАНОВІЧ,
майстар спорту СССР па міжнародных і рускіх шашках.

Гучная справа

13 ГАДОЎ КАЛОНІІ — МАКСІМАЛЬНЫ ТЭРМІН

Мінскі абласны суд вынес абвінаваўчы прысуд у дачыненні да вучня сярэдняй школы № 2 Стоўбцаў за наўмыснае жорсткае забойства двух чалавек.

Па справе ўстаноўлена, што малады чалавек 2003 года нараджэння з хуліганскіх матываў здзейсніў забойства двух чалавек — настаўніцы і вучня, а таксама спрабаваў забіць яшчэ двух.

Прадметам судовага разбору таксама сталі факты здзяйснення падлеткам асабліва злоснага хуліганства з ужываннем прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў якасці зброі для прычынення цялесных пашкоджанняў.

Пагадзіўшыся з пазіцыяй дзяржаўнага абвінаваўцы, па сукупнасці гэтых злачынстваў малады чалавек асуджаны да 13 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў выхаваўчай калоніі.

Як адзначылі ў Генпракуратуры, рашэнне суда сведчыць аб тым, што падлетак прызнаны ў стане свядомасці ў дачыненні да зробленага і што здзяйсненне ім злачынстваў абумоўлена хуліганскімі матывамі, іншымі словамі, імкненнем праявіць відавочную непавагу да грамадства і прадэманстраваць грэблівае стаўленне да агульнапрынятых правілаў паводзінаў.

Прысуд не ўступіў у законную сілу і можа быць абскарджаны і апратэставаны ва ўстаноўленым законам парадку.

Трагедыя ў сярэдняй школе № 2 Стоўбцаў адбылася 11 лютага. Вучань 10 класа ўдарыў нажом настаўніцу гісторыі і грамадазнаўства і вучня 11 класа. Яны памерлі на месцы здарэння. Падлетак кіраваўся хуліганскімі матывамі і незадоўга да здзяйснення забойства нанёс удар малатком свайму аднакласніку. Па заключэнні комплекснай стацыянарнай псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы, малалетні злачынца мог у поўнай меры ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў і кіраваць імі.

ЖАНЧЫНА ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ЗАБОЙСТВЕ

і падпале дачы ў вёсцы

У 1.31 ночы ў аператыўна-дзяжурную службу Мазырскага РАУС патэлефанавала невядомая жанчына і паведаміла, што забіла чалавека, хуткая ўжо прыехала. Заяўніца быталася ў словах, называла розныя месцы ў раёне, дзе, магчыма, адбылося цяжкае злачынства, пасля чаго сувязь абарвалася. Супрацоўнікі міліцыі неадкладна пачалі праводзіць неабходныя мерапрыемствы, каб высветліць асобу невядомай і дзе яна знаходзіцца.

Неўзабаве ад жыхаркі вёскі Раманаўка паступіла паведамленне, што да іх у дом стукаецца нейкая жанчына, крычыць, паводзіць сябе неадэкватна. На месца здарэння накіраваліся супрацоўнікі АУС.

Адначасова з гэтай жа вёскі паступіў выклік па факце ўзгарання аднаго з прыватных дамоў. Работнікі МНС прыбылі на пажар і патушылі яго. У згарэлым доме яны знайшлі труп жанчыны. Звязаўшы два здарэнні, праваахоўнікі разумелі, што званок невядомай і пажар — часткі аднаго цэлага.

Неўзабаве супрацоўнікі крымінальнага вышуку знайшлі ў вёсцы і затрымалі падазраваную ў здзяйсненні супрацьпраўных дзеянняў. Жанчына паводзіла сябе ненармальна, бо знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення. Толькі раніцай яна змагла паведаміць аператыўнікам сваю версію таго, што адбылося.

Як паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама, папярэдне ўстаноўлена, што 62-гадовая мазыранка разам са сваёй 67-гадовай знаёмай адпачывалі на дачы ў вёсцы. Пасля распіцця спіртных напояў паміж жанчынамі ўзнікла сварка. Больш маладая дачніца жалезнымі вілкамі некалькі разоў ударыла знаёмую па галаве, патэлефанавала ў міліцыю, падпаліла цюль і выбегла з памяшкання.

Следчыя, эксперты-крыміналісты і аператыўнікі праводзяць неабходныя мерапрыемствы па ўстанаўленні ўсіх абставін таго, што адбылося.

ПАЗАДАРОЖНІК СУТЫКНУЎСЯ З ЦЯГНІКОМ

Каля дзевяці гадзін раніцы ратавальнікам ад дзяжурнага чыгуначнай станцыі Асіповічы паступіла паведамленне аб ДТЗ з удзелам дызель-цягніка і легкавога аўтамабіля на чыгуначным пераездзе ў горадзе.

mchs.gov.by

На рэгуляваным чыгуначным пераездзе, абсталяваным светлавой і гукавой сігналізацыяй, адбылося сутыкненне дызель-цягніка, які рухаўся з Асіповіч у Салігорск, з легкавым аўтамабілем «Міцубісі-Паджэра». Было ўстаноўлена, што аўтамабіль перасякаў чыгуначныя пуці на забараняльны сігнал святлафора, у выніку чаго быў збіты саставам. Падчас сутыкнення кіроўца знаходзіўся ў машыне адзін, паведамляе МНС. Мужчына не пацярпеў.

У выніку ДТЗ аўтамабіль і цягнік атрымалі механічныя пашкоджанні. Чыгуначнае палатно не пашкоджана. Затрымка ў руху цягнікоў склала 57 хвілін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БУЛЬБАЧКА ЎРАДЗІЛА...

Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Па стане на першы тыдзень верасня ў сельскагаспадарчых арганізацыях убрана 2,4 тысячы гектараў бульбы — гэта больш за 8 % уборачнай плошчы. Накапана каля 88 тысяч тон бульбы пры сярэдняй ураджайнасці 365 цэнтнераў з гектара, што пераўзыходзіць леташнюю на аналагічную дату на 43 цэнтнеры. Сабрана каля 115 тысяч тон агародніны, у тым ліку каля 40 тысяч тон агуркоў, 50 тысяч тон таматаў, 200 тон баклажанаў, 180 тон перцу, 3,5 тысячы тон белакачаннай капусты, 160 тон пекінскай капусты, больш за 90 тон цвятной капусты, 1 тысяча тон сталовых буракоў, 7 тысяч тон морквы, 4,5 тысячы тон агародніннага гарошку, 300 тон кабачкоў і 4,5 тысячы тон рэпчатай цыбулі», — паведаміла ўраджайную статыстыку **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна КАРБАНОВІЧ.**

У дзяржсектары, сялянскіх і фермерскіх гаспадарках краіны сёлета плануецца атрымаць звыш 1 мільёна тон бульбы (111 % да ўзроўню мінулага года) і 624 тысячы тон агародніны (114 %). Мільён — гэта шмат ці мала?

Мяркуйце самі. З чаканага ўраджаю бульбы 185 тысяч тон пойдзе на насенне, 200 тысяч тон адправяць на прамысловую перапрацоўку, 180 тысяч тон — на патрэбы гандлю і грамадскага харчавання (у тым ліку для закладкі ў стабілізацыйныя фонды), астатняе — для іншай рэалізацыі, у тым ліку на экспарт. Што да агародніны, дык яе, у колькасці таксама 180 тысяч тон, плануюць накіраваць на патрэбы грамадскага харчавання і гандлю, а таксама для закладкі ў стабфонды, 43 тысячы тон будзе перапрацавана, больш за 400 тысяч тон прызначаць для іншай рэалізацыі, у тым ліку экспарту. Здаецца, больш чым дастаткова.

Цэны на яблыкі сёлета зашкальваць не павінны

Пра гэта заявіла **намеснік начальніка аддзела спажывецкага рынку Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Таццяна КРАСНЮК.** «Цэны новага ўраджаю будуць складвацца ў залежнасці ад попыту і прапановы», — нават так яна пракаментавала выказаныя ў шэрагу СМІ здагадкі пра тое, што з прычыны невысокага ўраджаю сёлета цэны на беларускія яблыкі вырастуць удвая.

«Цэны ў нас не рэгулююцца, яны дамоўныя. Прафільнае міністэрства мае права не больш за 90 дзён на працягу года ўстанаўліваць цэны на сацыяльна значныя тавары, у тым ліку і на яблыкі. Пакуль такой неабходнасці ў нас няма», — адзначыла прадстаўнік гандлю.

Варта нагадаць, што летась быў рэкордны за апошнія 10 гадоў ураджай яблыкаў. У сувязі з гэтым міністэрствам было прынята рашэнне для забеспячэння максімальнага продажу праз арганізаваны гандаль унесці змяненне ў пастанову аб асартыментных пераліках. Гандлёвым прадпрыемствам у два разы была павялічаная колькасць найменняў яблыкаў — да 2—6. Гэта прывяло да таго, што летась у чацвёртым кварталe доля айчынных яблыкаў павялічылася з 10 да 40 %.

Як адзначыла Таццяна Карбановіч, штогод плошча, якая выдзяляецца пад пасадку пладова-ягадных культур, павялічваецца на 500 гектараў. За 2016—2018 гады закладзена 2,3 тысячы гектараў інтэнсіўных садоў. На пачатак года ў краіне мелася 97,1 тысячы гектараў пладова-ягадных насаджэнняў, у тым ліку ў сельскагаспадарчых арганізацыях — 35 тысяч гектараў.

Са 160 тысяч тон пладоў і ягад, якія плануецца атрымаць сёлета, 155 тысяч тон — гэта яблыкі. У асобных садах у розных рэгіёнах ураджайнасць гэтых пладоў сёння дасягае больш чым 30 тон з гектара. Яблыкі ўжо рэалізуюцца на ўнутраным рынку і экспартуюцца. Цана на таварныя яблыкі вагаецца ад 70 капеек да 1,2 рубля за кілаграм у залежнасці ад сорту, таварнасці і кірунку выкарыстання. Для прамысловай перапрацоўкі яблыкі нарыхтоўваюцца па цане ад 15 да 30 капеек за кілаграм.

«Цана для прамперапрацоўкі склалася невысокая, часам ніжэйшая за сабекошт. У адпаведнасці з просьбамі, якія паступаюць з месяцаў, Мінсельгасхарчам з мэтай аптымізацыі нарыхтоўкі яблыкаў і недапушчэння пашкоджання ўраджаю накіраваны ліст на адрас аблвыканкамаў, канцэрна «Белдзяржхарчпрам», Белкаапсаюза з просьбай разгледзець магчымасць закупкі яблыкаў для прамперапрацоўкі па цане не ніжэйшай за 30 капеек за кілаграм», — паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення.

Цыбуля нятанная, але ёсць і будзе

У гэты межсезонны перыяд у нас будзе дастаткова рэпчатай цыбулі і цыбулі-сеянкі, праблемных сітуацый узнікаць не павінна. Так лічаць спецыялісты. Паслухаем іх довады.

Рэпчатая цыбуля ў нас у краіне ў прамысловых маштабах вырошчваецца больш за паўтара дзясятка гадоў. Асвоены сучасныя тэхналогіі яе вырошчвання з насення ў аднагадовай культуры. Вытворчасць рэпчатай цыбулі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак штогод складае прыблізна 200 тысяч тон. З гэтага аб'ёму каля 40—60 тысяч тон вырошчваецца ў сельгасарганізацыях, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках, што з'яўляецца асновай для закладкі ў стабілізацыйныя фонды, сховішчы, пры неабходнасці для паставак на экспарт.

«Па рэпчатай цыбулі былі пытанні ў вясновы перыяд, і мы іх прааналізавалі, каб у далейшым праблемных сітуацый не ўзнікала. Сёлета чаканая вытворчасць цыбулі складзе 37 тысяч тон, і мы зможам закласці ў стабілізацыйныя фонды рэпчатую цыбулю ў поўным аб'ёме», — сказала Таццяна Карбановіч.

Насельніцтва рэпчатую цыбулю вырошчвае ў асноўным з цыбулі-сеянкі. Агульная патрэба ў такой цыбулі складае 2,4—2,8 тысячы тон. На жаль, у нас яе вырабляецца каля 230 тон, а асноўны аб'ём увозіцца з-за мяжы. Штогод цэнтралізавана імпартуецца для рэалізацыі насельніцтву каля 750 тон цыбулі-сеянкі, астатнія аб'ёмы — праз гандлёвыя і іншыя камерцыйныя структуры. «Першы транш цыбулі-сеянкі завезены пад бягучую рэалізацыю, продаж ужо вядзецца ў магазінах сталічнай сістэмы па цане 4,5—6 рублёў за 1 кілаграм у залежнасці ад сорту. Другі транш яны плануюць завезці пад вясновую сяўбу, гэта значыць у пачатку новага года. Дагаворы заключаны, ураджайнасць сеянкі ў тых краінах, з якіх мы яе ўвозім, добрая, таму не павінна ўзнікнуць ніякіх праблемных сітуацый».

Грэцкі арэх будзе расці плантацыямі

А яшчэ ў нас закладваюцца плантацыі фундука і грэцкага арэха. Попыт на гэтыя прадукты добры. Таму цяпер у мэтах імпартазамяшчэння фермерскія гаспадаркі сумесна з навуковымі арганізацыямі разглядаюць магчымасці стварэння падобных садоў у прамысловых умовах нашай краіны. Ужо зараз у Гродзенскай і Мінскай абласцях фундук закладзены на плошчы каля 60 гектараў, а грэцкі арэх — каля 22 гектараў.

Прадстаўнік Мінсельгасхарча таксама расказала пра вытворчасць у нашай краіне некаторых іншых відаў культур. У прыватнасці, вытворчасць спаржавай фасолі засяроджана ў Гомельскім раёне, плошча складае больш за 50 гектараў. Чаканы аб'ём вытворчасці — 380 тон. Спаржавая фасоля накіроўваецца на замарозку, кансерваванне, нязначныя аб'ёмы рэалізуюцца ў свежым выглядзе.

А вось цукровая кукуруза прафесійна вырошчваецца ў акцыянерным таварыстве «Тураўшчына» Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Плошча пасадкі там павялічылася з 40 да 150 гектараў. Чаканы аб'ём вытворчасці сёлета — 1,5 тысячы тон. Бахчавых культур плануецца сабраць каля 450 тон, пасадкі сканцэнтраваны ў Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях. Ужо сабрана каля 160 тон кавуноў. Іх рэалізуюць праз сістэму «Белкаапсаюза». Адпускная цана за кілаграм айчынных кавуноў цяпер складае 40—60 капеек.

Стабфонды вызначаюць мясцовыя ўлады

Рашэнне аб запасах пладоў і садавіны на міжсезонне ў краіне раней прымаў Саўмін. Але, як аказалася, сітуацыя з забяспечанасцю прадуктамі на зіму ў нас досыць неаднародная, залежыць ад рэгіёна. Цяпер жа пытанне, колькі бульбы, капусты ці яблыкаў трэба нарыхтаваць у той ці іншай мясцовасці, вырашаюць абласныя выканаўчыя камітэты, а таксама Мінскі гарвыканкам. Пладоў і садавіны ў нас вырошчваецца дастаткова як у дзяржсектары, так і на прыватных падворках, таму рабіць вялікае цэнтралізаванае сховішча немэтазгодна.

Але ўсё ж для патрэб гандлю, грамадскага харчавання і закладкі ў стабілізацыйныя фонды будзе накіравана 28 тысяч тон пладоў і ягад, 27 тысяч тон перапрацуюць прампрадпрыемствы, астатняе пойдзе для іншай рэалізацыі, у тым ліку на экспарт.

Калі казаць пра стабфонды, то на міжсезонны перыяд будзе закладзена 43,6 тысячы тон бульбы, 23,2 тысячы тон капусты, 8,3 тысячы тон буракоў, 12,3 тысячы тон морквы, 12,6 тысячы тон рэпчатай цыбулі. Акрамя таго, у сельгасарганізацыях, фермерскіх гаспадарках маюцца спецыялізаваныя сховішчы, якія закладваюцца з восені для далейшай бягучай рэалізацыі і экспарту.

Праблема, і не толькі фермераў

Гэтае лета выдалася ўраджайнае на клубніцы. Але многія памятаюць фота з сецівa, на якім фермеры выкідалі ягады на абочыну з-за немагчымасці або нежадання прадаваць іх за капейкі. У жніўні нешта падобнае здарылася з небывалым ураджаем памідораў, асабліва па поўдні краіны. Нават я паспеў на гэты баль танных таматаў, калі на рынку ў Ждановічах у аптовым аддзеле іх прадавалі ў розніцу па 25—50 капеек.

«Улічваючы сітуацыю з клубніцамі, было даручэнне аблвыканкамам — забяспечыць наяўнасць гандлёвых месцаў, каб насельніцтва магло прыехаць і бесперашкодна самастойна рэалізаваць прадукцыю», — расказала Таццяна Краснюк. Было адкрыта каля васьмі тысяч дадатковых гандлёвых месцаў на рынках, аднак, як палічылі ў міністэрстве, 40 % з іх засталіся незапатрабаванымі.

Але застаецца самае балючае пытанне апошніх гадоў: чаму гандлёвыя сеткі і буйныя крамы аддаюць перавагу імпартнай гародніне і садавіне? На думку спецыяліста, шырокаму «ўкараненню» ў гандлёвыя сеткі беларускай сезоннай садавіны перашкаджае незацікаўленасць або нежаданне фермераў заключаць доўгатэрміновыя дагаворы і прапаноўваць тавар ужо расфасаваным і спакаваным для спажыўца.

Як адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення нарыхтовак спажыўкааперацыі Юрый САКАЛОЎСКІ,** іх арганізацыя старалася гнутка рэагаваць на рост аб'ёмаў ураджаю ў выпадку з клубніцамі і таматамі, пасылаючы ў паўднёвыя раёны закупачныя брыгады і пакідаючы «дзяжурыць» там сваіх прадстаўнікоў. Але некаторыя гаспадары прысядзібных участкаў вырошчваюць прадукцыю практычна ў прамысловых маштабах, якія ўжо нельга назваць лішкамі з падворкаў.

Для вырашэння праблем з рэалізацыяй Юрый Сакалоўскі прапануе сялянам стварыць сваю асацыяцыю, якая б займалася цэнавай палітыкай і продажамі. Магчыма, гэта і сапраўды выйсце.

Сяргей КУРКАЧ.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»
220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже капитальных строений

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Наименование объектов продажи:

капитальное строение (блок гаражей), расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Герцена, 14, общей площадью 286,2 кв. м.

Начальная цена продажи составляет 33 000 руб. (тридцать три тысячи рублей) с учетом НДС.

Капитальное строение (гараж), расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Даумана, 60, общей площадью 19 кв. м.

Начальная цена продажи составляет 3240 руб. (три тысячи двести сорок рублей) с учетом НДС.

Капитальное строение (гараж), расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Даумана, 60, корп. 1, общей площадью 19 кв. м.

Начальная цена продажи составляет 3840 руб. (три тысячи восемьсот сорок рублей) с учетом НДС.

Все вышеперечисленные объекты продаются в составе одного лота.

Открытый аукцион состоится 11.10.2019 в 10.00 по адресу: г. Борисов, пр-т Революции, 47, каб. № 301.

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 08.10.2019 включительно по адресу: г. Борисов, пр-т Революции, 47, кабинет 301.

По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефону 8 (017) 7731971.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 08.10.2019 включительно на счет № BY66AKBB66708589900540000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912. Размер задатка – 2004,0 бел. руб.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 20 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях «Беларусбанка»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Сямейная газета

Выпуск № 12 (130)

А ШТО ЯНЫ ТУТ ХОДЗЯЦЬ...

За апошнія некалькі гадоў да Мінска дакацілася з іншых сусветных сталіц і накрыла многіх з галавой хваля новай моды — на экалагічны транспарт — чытай, веласіпеды, ролікі і самакаты. Ахвотных пракаціцца з ветрыкам знянацку стала так шмат, што распачаліся цэлыя «дарожныя войны»: веласіпедыстаў — з кіроўцамі аўтатранспарту, самакатчыкаў — з малымі дзецьмі і матулямі пры каляскach, пешаходаў — з усімі пералічанымі.

Зусім хутка ў сталіцы ўжо чацвёрты раз пройдзе Еўрапейскі тыдзень мабільнасці — з 16 да 22 верасня адбудзецца шэраг мерапрыемстваў: ад эксперыментальных замераў спецыялістамі ўзроўню забруджвальных рэчываў у гарадскім асяроддзі да ўсталявання новых велапарковак, адукацыйных лекцый і забаўляльных праграм. Завершыцца тыдзень па традыцыі агульнагарадской акцыяй «Дзень без аўтамабіля», падчас якой, абяцаюць, кіроўцы змогуць бясплатна праехаць у метро і гарадскім наземным транспарце пры наяўнасці з сабой пасведчання кіроўцы і тэхпашпарта на аўто. А яшчэ ў гэты дзень, дакладней увечары, арганізатары запланавалі правесці масавы праезд веласіпедаў, што свецяцца. Перакладаючы на бытавы ўзровень — у гэты дзень як мінімум на сталічных веладарожках, многія з якіх вельмі ўмоўна аддзеленыя ад пешаходных белай паласой, істотна павысіцца канцэнтрацыя кіроўцаў «экалагічна чыстага транспарту».

І ўсё гэта было б цудоўна. Але не. І рэч не ў песімістычнай схільнасці бачыць наўкол шэрае — я якраз рэаліст. І, пабываўшы ва ўсіх іпастасях — мамы з каляскай і бягучымі дзецьмі, веласіпедысткі, пасажыра аўто, — бачу, як расце напружанне на дарогах і дарожках. Аматары веласіпедаў, самакатаў, гіраскутараў, сегвеяў і монаколаў даводзяць, што выступаюць за экалогію, эканомію часу і здаровы лад жыцця. Аднак карысць для ўласнага здароўя тут вельмі спрэчная (што, праўда, паездка па загружаных гарадскіх вуліцах уздоўж аўтадарог паляпшае стан арганізму?), а небяспека — усё больш відавочная. Узяць хоць бы некалькі гучных летніх выпадкаў са стужкі навін: у Мінску сустрэча самакатчыка і дзяўчынкі на вела/пешаходнай дарожцы скончылася для дзіцяці пераломам; святар на электрасамакаце груба парушыў ПДД, а на адной са сталічных вуліц камеры зафіксавалі «самакатчыка», які ехаў з хуткасцю 75 (!) кіламетраў за гадзіну; пад Жыткавічамі ў тумане адбылося ДТЗ з удзелам аўто і веласіпедыста, апошні загінуў; у Маладзечне падлетак на веласіпедзе пераязджаў чыгуначныя пуці і трапіў пад цягнік...

Ведаеце, што аб'ядноўвае гэтыя і многія іншыя выпадкі? Грэбаванне правіламі дарожнага руху, бяспечных паводзін на дарозе, а часам і проста здаровым сэнсам. Вырасла ўжо цэлае пакаленне людзей, якія ведаюць — альбо думаюць, што ведаюць — свае правы і не ведаюць абавязкаў. Яны, нібы Пітэр Пэн, усё ніяк не хочуць сталець і прымаць тое, што ў грамадстве неабходна жыць па правілах. Гэта, здаецца, элементарна: пераходзіш дарогу — паглядзі спачатку налева, потым направа, ідзеш ці едзеш увечары — паклапаціся пра тое, каб цябе было чутна і бачна, кіруеш транспартным сродкам — усведамляй, што ты цяпер крыніца павышанай небяспекі, і не стварай перашкод іншым удзельнікам дарожнага руху. Ды дзе там! Уладальнік электрасамаката, якога не так даўно затрымала ДАІ за язду ў нецвярозым стане, абвясціў, што самакат — не транспартны сродак, а спартыўны інвентар, таму нікому ён нічога не вінен...

Адзначым дзеля справядлівасці, што цераз гэта прайшлі і ў іншых краінах і знайшлі пэўныя рашэнні. Скажам, у Кітаі для электратранспарту вылучылі асобную паласу — на дарогах, а не пешаходных дарожках, і абазначылі яе колерам; у ЗША электрасамакатчыкам забаранілі карыстацца гаджэтамі і абмежавалі хуткасць 25 км/гадз.; нацыянальная паліцыя Грэцыі распрацоўвае для асабістага мікраэлектратранспарту спецыяльны дадатак у правілах дарожнага руху. У Беларусі ПДР таксама дапрацуюць, уключыўшы новыя пункты адносна веласіпедаў і модных «сродкаў персанальнай мабільнасці». Аднак гэта работа не толькі для законатворцаў. І нават у першую чаргу не для іх, а непасрэдна для ўдзельнікаў дарожнага руху. Перш чым указваць апаненту, што ён павінен рабіць, кожны чалавек за рулём мусіць задацца пытаннем, ці ўсё правільна робіць ён. Пачынаецца, як ні банальна, усё ў галаве і закладзеным у яе выхаванні — будзе гэта ўзаемная ветлівасць і павага альбо «качу куды захачу».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Тыя, хто побач

Анатоль КАШАПАРАЎ:

«Машыны я мяняў кожны год, а жонка ўсё жыццё адна»

Знакаміты спявак расказаў, што афіцыйна заключыў шлюб амаль праз чвэрць стагоддзя сумеснага жыцця

Ларыса і Анатоль.

САЛІСТ «залатога складу» ансамбля «Песняры» Анатоль КАШАПАРАЎ — адзін з нямногіх музыкантаў калектыву, за плячыма якога адзін шлюб. Стаж сямейнага жыцця спевака — амаль 37 гадоў. Але, гледзячы на Ларысу і Анатоля, наколькі яны жвавыя, іранічныя, у гэта цяжка паверыць.

— Раскажыце, як адбылося знаёмства?

Анатоль: — Дзень быў лёгкі, усяго толькі два канцэрты. Я адпачываў у перапынку паміж канцэртамі ў нейкім зацішным кутку Віцебскага дома афіцэраў. Убачыў прыгожую дзяўчыну і пайшоў знаёміцца...

Ларыса: — Ён пачаў з таго, што не жанаты, жыве ў Мінску з бацькамі і малодшай сястрой.

— А дзяўчына апынулася за кулісамі? Мусіць, фанатка «Песняроў»?

Л. — Я працавала мастацкім кіраўніком Дома афіцэраў. Вядома, як музыкант я ведала, хто такія «Песняры», але дакладна не была з тых дзяўчат, якія пільнавалі славутых артыстаў. Мой тата вайсковец, і дзяцінства прайшло ў Азербайджане. У Баку я вучылася ў музычнай школе, вельмі захаплялася класічнай музыкай. Неяк мая педагог дала мне білет на канцэрт «Песняроў», сказала, што гэты ансамбль варта паслухаць. Мяне вельмі ўразілі дзве песні: «Крык птушкі» і «Снег» у выкананні Уладзіміра Мулявіна і Юрыя Дзянісава.

Пасля выхаду ў запас тата рваўся на радзіму, у Беларусь. Мы прыехалі да сваякоў у Віцебск, а яны кажуць: «Песняры» такую класную песню спяваюць. Уключаюць радыё «Маяк», а там якраз «Волагда». А Толя вельмі правільна прадставіўся пры знаёмстве. У бок жанатага мужчыны я нават не паглядзела б, гэта для мяне прынцыпова.

— Як развіваўся раман?

А. — Імклівa. На наступны дзень павёз Ларысу ў Мінск знаёміцца з бацькамі.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Разбураючы стэрэатыпы

ЛЯЦІ, НАДЗЕЙКА

Яна была за палярным кругам і пераскакала экватар. Жыла ў юртах пасярод пустыні і піла ваду з Ганга. Выпраўлялася ў працяглыя падарожжы, сама складала сабе маршруты, падчас якіх наведвала і тыя краіны, якія спачатку ў планы не ўваходзілі. Яна не баіцца застацца адна ў незнаёмым кутку свету, падкажа, як выжываць, калі маеш абмежаваныя фінансавыя магчымасці. І ўпэўнена, што калі ў чалавека ёсць мара, ён можа знайсці спосабы, як яе здзейсніць. Інакш — будзе шукаць тысячу прычын, чаму яму «не адолець» тую ці іншую справу.

З гэтай «пералётнай птушкай», якая пабывала ва ўсіх краінах былога СССР, акрамя Туркменістана, аб'ездзіла Еўропу і Паўднёва-Усходнюю Азію, адзначылася ў Камбоджы, В'етнаме, Малайзіі, Інданезіі, Кітаі і г. д., я пазнаёмілася на «Жывой бібліятэцы» — сустрэчы, скіраванай на барацьбу са стэрэатыпамі. Надзея сутыкаецца з тым, што людзі лічаць, што такія, як яна, не здольныя выконваць многія работы, самастойна перамяшчацца і наогул «не павінны хацець нечага большага, чым тое, што прапануе дзяржава». Але яна сцвярджае, што праблемы са зрокам не павінны быць абмежаваннямі. З інваліднасцю другой групы па зроку Надзея аб'ехала каля 40 краін, і падарожнічае дзяўчына аўтаспынам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

ШТО ЧАКАЕ БАЦЬКОЎ У АБНОЎЛЕНЫМ ПРАЦОЎНЫМ КОДЭКСЕ

Давайце разгледзім змены ў Працоўны кодэкс, якія датычацца водпуску для бацькі пры нараджэнні дзіцяці, а таксама водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў, і тых, хто выхоўвае дзіця ў адзіночку. Нагадаем, што ўсе гэтыя змены пачнуць дзейнічаць ужо са студзеня 2020 года.

Водпуск для бацькі (айчыма) пры нараджэнні дзіцяці

Працоўны кодэкс дапоўнены новым артыкулам 186, згодна з якім, пры нараджэнні дзіцяці і выхаванні яго ў сям'і наймальнік абавязаны будзе па жаданні бацькі (або айчыма) дзіцяці даць яму водпуск без захавання заработнай платы.

Працягласць гэтага водпуску, як тлумачыць Мінпрацы і сацабароны, павінна складаць не больш за 14 каляндарных дзён. Пры гэтым іншая працягласць або аплата такога водпуску могуць быць прадугледжаны калектыўным дагаворам або самім наймальнікам.

Водпуск будзе давацца па заяве бацькі на працягу шасці месяцаў пасля нараджэння дзіцяці. Гэта будзе перыяд, цягам якога бацькі змогуць ажыццяўляць догляд нованароджанага адначасова, калі ў іх будзе такое жаданне.

Удакладненні, якія датычацца водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў

Артыкул 185 Працоўнага кодэкса дапоўнены выпадкамі, пры надыходзе якіх працуючы бацька ці іншы сваяк, член сям'і дзіцяці будуць мець замест маці права на водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў. У прыватнасці, гэта датычыцца выпадкаў, калі маці працуе ў прадстаўніцтве міжнароднай арганізацыі ў Беларусі, дыпламатычным прадстаўніцтве, консульскай установе замежнай дзяржавы, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь.

Акрамя таго, удакладнена, што водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў даецца па вырашэнні сям'і працуючым бацьку або іншаму сваяку, члену сям'і дзіцяці ў выпадку, калі маці дзіцяці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (як падкрэсліваюць у Мінпрацы і сацабароны) выйшла на работу (службу), вучобу, праходзіць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме або з'яўляецца адвакатам, натарыусам, індывідуальным прадпрымальнікам, творчым работнікам, фізічнай асобай, якая ажыццяўляе рамесную дзейнасць, дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму.

Калі дзіця выхоўвае толькі адзін

Як тлумачаць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, у артыкул Працоўнага кодэкса ўключана паняцце «адзінокія бацькі» і яго вызначэнне.

Так, адзінокімі бацькамі прызнаюцца:

— маці (бацька), якая не знаходзіцца (які не знаходзіцца) ў шлюбе і якая выхоўвае (які выхоўвае) непаўналетняе дзіця ў выпадку, калі іншы з бацькоў памёр, пазбаўлены бацькоўскіх правоў, прызнаны недзеяздольным, абвешчаны памерлым або прызнаны без вестак адсутным;

— маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе і выхоўвае непаўналетняе дзіця, звесткі пра бацьку якога ўнесены ў запіс акта аб нараджэнні дзіцяці па яе заяве або па ўказанні іншай асобы, якая падала заяву аб рэгістрацыі нараджэння;

— усынавіцель (удачарыцель), які не знаходзіцца ў шлюбе і які выхоўвае непаўналетняе дзіця.

Змены ўнесены ў артыкулы 16, 268 і 271 Працоўнага кодэкса.

З улікам унесеных змяненняў:

1) забараняецца адмаўляць адзінокім бацькам у заключэнні працоўнага дагавора па матывах, звязаных з наяўнасцю дзяцей ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў (дзяцей-інвалідаў — да васямнаццаці гадоў);

2) не дапускаецца скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка:

— у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў і ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 3-5 артыкула 42 Працоўнага кодэкса,

— з адзінокімі бацькамі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў;

— у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў (пункт 1 артыкула 42) і ў выпадку, які прадугледжаны пунктам 5 артыкула 42 Працоўнага кодэкса, — з адзінокімі бацькамі, якія маюць дзіця ва ўзросце ад трох да чатырнаццаці гадоў (дзіця-інваліда — да васямнаццаці гадоў).

Акрамя таго, гарантыі, прадугледжаныя на сённяшні дзень для працуючых жанчын-маці, пашыраюцца на працуючых адзінокіх бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей адпаведнага ўзросту, у сувязі з чым унесены змены ў артыкул 271 Працоўнага кодэкса.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

ЛЯЦІ, НАДЗЕЙКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адно з апошніх яе падарожжаў расцягнулася на паўгода — чатыры месяцы яна правяла ў Індыі, па месяцы ў Непале і на Шры-Ланцы.

— Гэта была мара, я збірала грошы і доўга не магла рашыцца. Баялася, што дрэнна бачу, што мяне могуць забіць, збіць машынай, я згублюся ці яшчэ што здарыцца, — прызнаецца дзяўчына. Але авантурнае падарожжа прынесла столькі розных уражанняў і адкрыццяў! Яна бачыла рытуалы па спальванні нябожчыкаў, калі попел пасля «перадаецца» Гангу, абыходзіла бокам бадзяжных кароў, бачыла свавольных малпачак, якія могуць скрасці ў людзей мабільнікі ці іншыя рэчы, трапіла на Кумбха-мелу — рэлігійны фестываль, які бывае ў Індыі раз на 12 гадоў. (На яго з'язджаюцца мільёны людзей, і тэрыторыя, дзе размяшчаюцца паломнікі, расцягваецца на дзясяткі кіламетраў!) Яна купалася ў Гангу. Часцявалася бясплатнай ежай, якую раздавалі на фестывалі. Калі пачастунак аказаўся вельмі вострым, дзяўчыне прапанавалі запіць яго вадой. Толькі пасля яна засумнявалася і спытала, адкуль вадзічка. «З Ганга. Не пярэ: ты не можаш захварэць — наадварот, вылечыш хваробы. У Гангу вада святая», — быў адказ. Дзяўчына можа доўга апавядаць і пра гэта падарожжа, і пра многія іншыя. І яна ўпэўнена, што любы чалавек, у якую б жыццёвую клетку ні загналі яго стэрэатыпамі, можа вырвацца з яе...

ЗАМКНЁНАЕ КОЛА?

— У мяне інваліднасць з дзяцінства. І я доўгі час знаходзілася ў асяроддзі людзей з такімі ж праблемамі — вучылася ў спецшколе, працавала на прадпрыемстве для інвалідаў па зроку. Гэта крыху ізаляванае грамадства, многія верцяцца толькі сярод падобных, яны жэняцца з такімі ж, іх сябры — інваліды. Гэта замкнёнае кола. Якое можа быць стаўленне ў інвалідаў да саміх сябе, калі яны пастаянна чуюць, што ні на што не здатныя? — заўважае дзяўчына.

Людзей з фізічнымі праблемамі з дзяцінства могуць навучаць, што ім не варта нечага хацець, ім не нахапаць зорак з нябёс. У спецыялізаванай школе, дзе вучылася Надзея, дзеці пастаянна чулі, на якім заводзе «яны будуць працаваць». А навошта нейкія памкненні і якая можа быць прага да ведаў, калі за чалавека ўжо прапісалі шлях, па якім яму рухацца? І нават калі дзяўчына пасля дзявятага класа вырашыла паступаць, некаторыя настаўнікі спрабавалі яе адгаварыць: «Ну куды ты сунешся? Як ты зможаш вучыцца, ды сярод дзяцей, якія пасля звычайных школ больш прыстасаваныя?»

— Напачатку ў тэхнікуме мне было складана. Я прызвычаілася вучыцца, калі клас маленькі і можна бліжэй падыходзіць да дошкі, каб усё разгледзець. Але ў мяне ніколі не ўзнікла думкі, што я дарэмна паступала. Наадварот, грэла веданне, што ў спецшколу я ўжо не вярнуся. Канешне, даводзілася ў тэхнікуме чуць і грубыя словы наконт таго, што я не бачу, падлеткі могуць быць даволі жорсткія. Але гэтага было мала, і з кожным годам негатыву рабілася менш: калі людзі сталеюць, з большым разуменнем ставяцца да гэтага, — прызнаецца Надзя. — Але і цяпер, нягледзячы на тое што мне амаль 30 гадоў, я пастаянна ад некага чую парады ці пытанні, калі яны бачаць, як я блізка нешта падношу да вачэй. Мне могуць прапанаваць «схадзіць да доктара», «насіць лінзы», «зрабіць лазерную карэкцыю зроку». Ды яшчэ могуць і пакрыўдзіцца, што я такі іх «клопат» не прымаю. Але кожнаму ж не патлумачыш, што гэта не лечыцца і што не ўсё можна правіць лазернай карэкцыяй, што акуляры не для ўсіх можна падабраць. Сляпому якія акуляры ні пачапі, ён не стане бачыць.

Пасля тэхнікума Надзя вучылася ў ВНУ. Выбар прафесій, якія можна было атрымаць з праблемамі са зрокам, у дзяўчыны быў абмежаваны, ёй дазваляліся пераважна педагагічныя спецыяльнасці. Былі праблемы і з пошукам работы. Часам дзяўчына яшчэ і нічога сказаць не паспявала на сумоўі, а ёй ужо выносілі прысуд: «Вы ж так дрэнна бачыце, як жа будзеце ў нас працаваць, не справіцеся...»

САКРЭТЫ ВЫЖЫВАННЯ

Але яна спраўляецца з тым, на што не кожны цалкам здаровы чалавек адважыцца. Чуеш яе аповеды і дзівішся. Здаецца, ну як можна выбрацца ў нейкі дзікі свет адной, без ведання мовы і амаль без грошай...

— У асноўным тое, што выдзяляю на падарожжы, — мая пенсія па інваліднасці. Гэта .невялікія грошы, нямногім больш за 100 долараў. Стараюся ўкласціся ў гэтую суму. У Індыю можна і без грошай паехаць. Там многа мясцовых людзей, якія не працуюць і жывуць без грошай, можна далучыцца да іх. Тут ужо многае залежыць ад таго, на што вы гатовы пайсці. Часам сама сабе дзіўлюся. Напрыклад, ці гатовы вы ехаць у цягніку джэнерал-класу — гэта бясплатна, але людзей там як селядцоў у бочцы: калі цягнік пад'язджае, нават сесці ў яго складана, пасажыры так і едуць, звісаючы з дзвярэй. Можна знайсці вельмі танную ежу, калі не саромецца. У Індыі можна карміцца ў храмах — індуісцкія мне не вельмі спадабаліся, там брудна, а ў сікхаў — чысценька.

Падарожжа аўтастопам — гэта ўжо добрая эканомія. Транспарт можа трапіцца самы розны: дзяўчыне даводзілася ездзіць і на рэанімацыйных машынах, і ў катафалку (без нябожчыка), яе падвозіла паліцыя. З цеплынёй яна згадвае, як у Кыргызстане ехала ў грузавічку на цюках з авечай воўнай. Спыняцца можна ў школах, бальніцах, храмах. Як варыянт — падысці да ахоўніка і папрасіцца, каб пусціў пераначаваць ці дазволіў паставіць намёт на ахоўнай тэрыторыі. Спыняюцца падарожнікі ў танных хостэлах ці па каўчсерфінгу (суполкі людзей, якія прымаюць такіх турыстаў). Запрасіць могуць у госці і кіроўцы альбо мясцовыя жыхары. У мусульманскіх краінах, калі бачаць чалавека з заплечнікам, могуць падысці запытацца: «Хто ты, што ты? Будзь маім госцем».

— Моцна ўразіла Манголія: «Уявіце. Сям'я жыве пасярод пустыні ў адной юрце, і нічога навокал — ні забаў, ні крам, ні суседзяў (да апошніх трэба сесці ў машыну і даехаць). Няма ні прыбіральні, ні душа, ні прысмакаў для дзяцей. Уся ежа — мяса ды цеста. І нават вада салёная. Суровыя ўмовы: летам пустыня праграваецца да 40 градусаў, а зімой вельмі холадна і вецер. Разумееш, як многа ў цябе ёсць у Беларусі». Можа, таму жыхары пустыні, асабліва дзеці, так радаваліся падарожніцы, а госця з імі знаходзіла кантакт праз жэсты, бо англійскай мовы жыхары юрты не ведалі.

— Чаго трэба асцерагацца, калі падарожнічаеш аўтастопам? — цікаўлюся ў Надзеі.

— Гэта не столькі пра аўтастоп, колькі пра тое, што дзяўчына падарожнічае адна, асабліва ў такіх краінах, як Індыя, Шры-Ланка. Нават калі проста спыняцца ў гатэлі, хостэле ў экзатычнай краіне, трэба быць гатовай, што ты, такая беласнежка, будзеш прыцягваць увагу мужчын. З табой захочуць пазнаёміцца, і не заўсёды з добрымі намерамі. У людзей могуць быць няправільныя ўяўленні, яны глядзяць непрыстойныя фільмы і могуць лічыць, што еўрапейскія ці рускія дзяўчаты даступныя. Трэба гэта ўлічваць, быць менш уразлівай да гэтага, не баяцца даваць адпор. Табе могуць задаваць пытанні, і на іх заўсёды трэба даваць дакладны адказ, каб ніхто не адчуў у табе слабасць, інакш ты робішся ўразлівай. Перад падарожжам трэба шукаць інфармацыю пра краіну, у якую збіраешся ехаць, вывучаць традыцыі, культуру. У многіх краінах пэўны знешні выгляд будзе непрымальны. Калі едзеш у Індыю ці Турцыю, адзенне павінна быць закрытае. У Іране, калі будзеш не па каноне апрануты, наогул можаш у паліцыю трапіць. Трэба вывучыць, якія хваробы ў пэўнай краіне — магчыма, прыдзецца зрабіць прышчэпкі. Пацікаўцеся правіламі бяспекі.

— Праблемы са зрокам могуць перашкаджаць у дарозе?

— У Непале я не трапіла ў горы. Я ведаю, што дрэнна бачу, у гарах буду ісці павольна, без падтрымкі магу ўпасці. Але і ў Беларусі я магу не заўважыць прыступку ці яму. Канешне, можна было б знайсці кампанію, але гэта былі б выпадковыя знаёмыя, мне не хацелася іх абцяжарваць, і я не была ўпэўненая, калі б нешта здарылася, што чужыя людзі не кінуць мяне. Уяўляла і вырашыла, што нейкая мяжа ў мяне ёсць, так нікуды і не схадзіла. Хоць, калі падарожнічаеш, бачыш, колькі ў свеце добрых людзей. Таксама ў дарозе мне дапамагаюць карты, анлайн можна адразу даведацца, дзе знаходзішся.

Дзяўчына прызнаецца, што падарожжы дапамагаюць многае зразумець, перагледзець: «Беларусы не вельмі шчаслівыя, ідзеш па вуліцы, а людзі не ўсміхаюцца. Мы любім многа скардзіцца.. А недзе ў іншай краіне ў чалавека, можа, наогул нічога няма, ён калека, але ён будзе ўсміхацца, смяяцца і адчуваць сябе шчаслівым. Таму я так люблю Азію, там ёсць чаму павучыцца. У некаторых краінах можа не быць шыкоўных краявідаў, але там цудоўныя гасцінныя людзі. І гэта вельмі цікава — даведвацца пра іх жыццё, абменьвацца думкамі».

А таксама падарожжы дапамагаюць змагацца са стэрэатыпамі, якія, на жаль, пакуль яшчэ вельмі многім перашкаджаюць узляцець.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.



«Машыны я мяняў кожны год...»

Ларыса і Анатоль.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Анатоль, а колькі вам было гадоў, калі жаніліся? Здаецца, вы не спяшаліся...

— Калі пазнаёміўся з Ларай, было 33, а яна на дзевяць гадоў маладзейшая. Я сапраўды не спяшаўся, хоць у часы маёй маладосці жаніліся рана, а я прыйшоў у ансамбль у 21 год. Ну і практычна адразу пачаў назіраць за сямейным жыццём калег. Мне здавалася, што яно зводзіцца да выцягвання грошай з мужчыны, потым пайшлі скасаванні шлюбаў. Зразумела, што я не спяшаўся.

Ціску з боку родных на мяне, маўляў, ажаніся, не было. Але гадоў так у 30 я падумаў, што пара. Быў у мяне раман з дзяўчынай з Ленінграда. Запрасіў яе ў Мінск на тры дні, а потым памяняў зваротны білет на дзень раней. Не магу, калі на мяне ціснуць, не пакідаюць ніякай асабістай прасторы.

— Хто ў вас у сям'і саліст?

А. — Мы — дуэт. Мы ўсё абмяркоўваем. Разам прымаем рашэнні. І адно за аднаго, за дзяцей гарой стаім!

Л. — Часам мы адначасова пачынаем гаварыць і прамаўляем аднолькавыя словы.

— Дзяцей у вас трое. Двое нарадзіліся ў Беларусі. Мусіць, пакуль не далі канцэрт у радзільным доме, жонку не выпісвалі?

А. — У нас усё было сціпла. Імправізаваны канцэрт «Песняры» давалі, толькі калі першую жонку Мулявіна — Лідзію Кармальскую — забіралі з радзільні з Валодзем-малодшым. Я вам па сакрэце скажу, што ўсе нашы дзеці фармальна пазашлюбныя. Мы ж распісаліся толькі ў 2007 годзе ў Амерыцы, калі нас гэтая тэма юрыдычна прыціснула.

— Вось гэта нумар! А вашы калегі заўсёды казалі: Кашапараў — узорны сем'янін.

А. — Сем'янін ты ці не, ад штампа ў пашпарце, па-мойму, наогул не залежыць.

— Ларыса, палажыўшы руку на сэрца, вы таксама так думаеце?

Л. — У нашым выпадку штамп нічога не змяніў. Я заўсёды была ўпэўненая ў тым, што ў любой сітуацыі Толя будзе паводзіць сябе высакародна. Часам у маладых сем'ях надыходзіць разлад, калі з'яўляецца дзіця. Нас жа дзеці яшчэ больш з'ядналі. Толя спяваў ім калыханкі, купаў іх, гуляў з імі. Да гэтага часу ёсць тэмы, якія дзеці абмяркоўваюць толькі з ім, маўляў, маме гэта ведаць неабавязкова. І я гэта прымаю. Прытым што ў мяне таксама выдатныя адносіны з дзецьмі. З дочкамі, мне здаецца, мы ўвогуле сяброўкі, але я крыху больш строгая. Толя заўсёды пасціў дзяцей.

— Ці часта суправаджалі мужа на гастролі?

Л. — У «Песняроў» была традыцыя — летам браць з сабой сем'і ў курортныя гарады. А так нячаста ездзіла, таму што заўсёды працавала. Толя выдатна ўтрымліваў сям'ю, але зноў-такі я лічу, што жанчына павінна быць фінансава незалежная. На памаду і туфлі трэба мець свае грошы! Тады жанчына не будзе ўспрымаць мужчыну як крыніцу свайго існавання і бязмежна ад яго залежаць. Такія адносіны ні да чаго добрага не прыводзяць. Нашых дзяўчынак мы выхоўвалі ў тым духу, што ў жанчыны павінна быць прафесія. Яны абедзве вырашылі, што



Анатоль КАШАПАРАЎ з дзецьмі.

будуць медыкамі, і цяпер працуюць у адным шпіталі ў Сан-Францыска.

— Ларыса, у «Песняроў» было шмат прыхільніц. Раўнавалі, калі ён без вас выязджаў на гастролі?

Л. — Я вельмі раўнівая, калі шчыра. Ведаеце, пару разоў жонка аднаго з музыкантаў агітавала мяне раптам прыехаць у горад, дзе ў «Песняроў» канцэрты былі дзён дзесяць. Яна была ўпэўненая, што зловіць свайго мужа на адзюльтэры. І гэта будзе нагода не разысціся з ім, а, як сёння кажуць, раскруціць на грошы. Мне яна казала: і твой таксама сваволіць. Я з такімі рэвізіямі не ездзіла. Не таму, што вочы не бачаць, сэрца не баліць, а таму, што давярала Толіку. Наогул перакананая: без даверу няма сям'і.

Вось яшчэ што скажу, хоць на мяне пакрыўдзяцца многія музыканты. У савецкі час артысты ў інтэрв'ю маглі гаварыць толькі пра творчасць. Усе гэтыя «амурныя» гісторыі ўсплылі ўжо ў перыяд галоснасці. Не сумняваюся, што ў хлопцаў былі раманы і раманчыкі, усякага роду эратычныя прыгоды. Але я ўпэўненая, што многае і перабольшвалася. У 70—80-я гады ў іх было па чатыры канцэрты ў дзень. Велізарныя залы, жывы гук. А яшчэ рэпетыцыі. Колькі магло застацца часу і сіл на тыя прыгоды?

— Неверагодна! Прыблізна тое ж самае казала мне жонка іншага музыканта. Цяпер Анатоль аспрэчыць.

А. — За іншых не скажу, а я — адказны муж. З вышыні пражытых гадоў думаю, што стварацца сям'ю трэба пасля трыццаці. Каб, як кажуць у народзе, нагуляцца, набыць нейкі вопыт у адносінах. У мяне так атрымалася, што машыны я мяняў кожны год, а жонка ўсё жыццё адна. І я вельмі рады, што сустрэў Ларысу. Гэта на сто працэнтаў мой чалавек, бо за 37 гадоў мы не надакучылі адно аднаму.

— А як вас у гасцініцы сялілі ў адзін нумар? Па савецкіх правілах патрэбен быў штамп у пашпарце.

А. — Хто ж «песняру» адмовіць? Я заўсёды паважліва ставіўся да тых, каго ў рускай класічнай літаратуры назвалі «маленькім чалавекам». Камфорт у гатэлі значна больш залежыць ад пакаёўкі, чым ад дырэктара. Таму мы добра ўладкоўваліся. Хоць трэба сказаць, што і такія моманты былі: адзін музыкант адцягвае ўвагу дзяжурнай па паверсе, іншыя праводзяць у нумар дзяўчат.

— Анатоль, артысты з «Песняроў» казалі, што вы такі дзелавы хлопец — першы ў ансамблі аўтамабіль купілі, абзавяліся лецішчам.

А. — А што дзіўнага? Першую машыну купіў яшчэ да жаніцьбы. Зараблялі мы добра. Таму на машыну можна было хутка назапасіць грошай. Я яшчэ ўсім жанатым калегам пазычаў грошы, калі ім не хапала. Лецішча, дакладней, дом у вёсцы Лапаровічы, таксама я першы купіў. Потым гэты дом прадаў Мулявіну, ён там грандыёзную перабудову задумаў. А ў мяне ўжо быў участак у садовым таварыстве творчых работнікаў «Сябры».

— Хто вырашыў ехаць у Амерыку?

Л. — Мы разам прынялі такое рашэнне. У пачатку 90-х, мне здаецца, усе, хто мог, з'язджалі з Беларусі, ды і ўсяго былога СССР. Было цяжка і страшна...

А. — Шчыра: мы, вядома, пры Саюзе жылі лепш, чым шараговы грамадзянін. За мяжу выязджалі. Вар'яцкая папулярнасць ансамбля, поўныя залы. Ужо ў канцы 80-х прагучалі трывожныя званочкі. Пачалося выццё па талонах на цукар і шкарпэткі, людзям было не да канцэртаў. Калі ў мяне ў адзін дзень практычна разабралі машыну, а яшчэ раней мы баяліся адпускаць дзяцей адных на вуліцу, зразумелі, што трэба нешта мяняць. У 1991-м я з'ехаў у Амерыку.

— А сям'я?

Л. — Толя з'ехаў паглядзець, што там і як, падрыхтаваць глебу. Я з дзяўчынкамі засталася ў Мінску.

— А не баяліся: сівізна ў бараду... Адзін у іншай краіне.

А. — Які там чорт у рабрыну... Трэба было думаць пра выжыванне сям'і. Ларыса з дзяўчынкамі прыехалі праз год. Я ўжо казаў некалі ў інтэрв'ю: Амерыка — гэта працоўны лагер з узмоцненым харчаваннем. Але там рэальна зарабіць. І нікому не цікава, топ-менеджар ты або просты рабацяга, ацэньваюць цябе па тым, чаго ты дасягнуў. Першыя гады і я, і Ларыса працавалі па 16-18 гадзін у дзень, потым выкараскаліся з крызісу 2008 года.

— Гэта значыць, тут вы — славутасць, а там — усё з нуля.

А. — Славутасці яшчэ цяжэй. Мне казалі, маўляў, вас або вашу жонку нам нязручна браць на такую работу. І вось атрымлівалася, што на «такую» ім нязручна, а вартай «песняра» работы няма. Ну і я таксама не зусім правільна сябе павёў. Прыехаў як звычайны эмігрант, а трэба было ўсё дасье везці, амерыканскі часопіс са сваім фота на вокладцы. Славутасці там вельмі добра зарабляюць. Цяпер у нас ёсць свой дом, а да таго і ў Лос-Анджэлесе, і ў Нью-Ёрку пажылі.

У Лос-Анджэлесе мы апынуліся падчас землятрусу. Другі раз у жыцці трапіў у такі пераплёт. Першы раз — на гастролях у Душанбэ.

Л. — У Нью-Ёрку ў Толі з'явілася работа ў рэстаране, усё ішло нядрэнна. Але тут у 1994 годзе патэлефанаваў Мулявін і запрасіў мужа на юбілей «Песняроў». Ён паляцеў і пасля юбілею некалькі месяцаў працаваў з імі. Тым часам ансамбль, у якім Толя працаваў у Штатах, звольнілі з рэстарана, маўляў, без Кашапарава вы нам не патрэбныя. Ён прыехаў — работы няма. Звярнуўся ў беларускую дыяспару. Там расказалі, як яны дапамагалі іншым беларускім музыкантам-эмігрантам, і абяцалі падумаць, што могуць зрабіць для нас. Час ішоў, але ніхто так нічога і не прыдумаў. Мы былі гатовыя згаджацца на любую работу — трэба жыць, вучыць дзяцей, а нам кажуць, што ах, вам такое прапаноўваць не па статусе. Мы рванулі ў Фларыду, далей ад прыхільнікаў «Песняроў».

— І там у вас з'явілася свая піцэрыя...

А. — Сваёй яна не адразу стала. Спачатку мы там былі наёмныя работнікі. Потым выкупілі, нават дзве, моцна пераплаціўшы. Магу даць бясплатную параду ўсім, хто хоча шукаць лепшай долі за мяжой: без доўгага ведання мовы, з нашай славянскай бязладнасцю — калі ленавацца чытаць, што ў дагаворы напісана самым дробным шрыфтам, — давядзецца цяжка. Гэта ўжо значна пазней мы сталі дзейнічаць па-амерыканску: вывучаць дакументы, наймаць адвакатаў. Піцэрыі мы прадалі, калі фактычна пачалі жыць на дзве краіны — Амерыку і Беларусь. Нават на тры — яшчэ і Расія.

Л. — А давайце я раскажу цікавую гісторыю з нашага амерыканскага жыцця. Неяк увечары ў адной піцэрыі скончыўся сыр. Толя паехаў па яго ў іншую. Яго ўсё няма і няма. Я хвалююся, кур'ер чакае заказ... Раптам раздаецца званок, Толя кажа, што ён арыштаваны і знаходзіцца ў паліцэйскім пастарунку. Разам з кур'ерам паехалі туды. Кажуць, Толю арыштавалі як злоснага неплацельшчыка аліментаў і ўладальніка фальшывага пасведчання кіроўцы. Паліцэйскія вераць не нам, а камп'ютару. Дзень тады яшчэ быў дажджлівы. Я плакала разам з дажджом. Заплаціла заклад, Толю адпусцілі з пастарунка ў пяць раніцы. А ў сем мы пайшлі ў дом правасуддзя разбірацца, у чым справа. Там ні ў адным спісе не было такога даўжніка і з правамі ўсё ў парадку. У Амерыцы Толя атрымаў правы кіроўцы-прафесіянала. Увесь сыр-бор здарыўся з-за збою ў камп'ютары паліцэйскіх. У такіх выпадках у Амерыцы прынята патрабаваць кампенсацыю маральнай шкоды. Паліцэйскі пастарунак выплаціў 5 тысяч долараў. Толькі мы ўжо разумелі, што для поспеху ў цяжбе трэба наймаць адваката. З пяці тысяч мы атрымалі роўна палову сумы, другая частка — ганарар юрыста.

— А дзеці разумеюць, што іх тата — славуты артыст?

Л. — Канешне, яны ведаюць, што тата выступаў у самым папулярным ансамблі СССР. І адгалоскі гэтай славы ёсць і цяпер, калі яго пазнаюць на вуліцах у тым жа Віцебску, дзе мы часта бываем. У Дашы ў шпіталі былы суайчыннік прачытаў на бэйджы яе прозвішча і пытаецца: «Вы дачка Анатоля Кашапарава з «Песняроў»?» Была яшчэ вельмі смешная гісторыя. Мы з малодшым сынам пайшлі ў Эрмітаж. У нейкі момант каля Толі сабраліся прыхільніцы. Даніла кажа: «Мама, яны пазналі Толыйка Кашьепарава?» Так, малодшыя дзеці размаўляюць з акцэнтам...

— Ваш трэці сын нарадзіўся ў Амерыцы. А ў Беларусі ён быў?

А. — Вядома, дзеці прыязджалі. Старэйшая дачка Лена шмат што памятае з нашага жыцця тут, малодшая — вельмі цьмяна. Даша і Даніла па-руску гавораць, а вось пісаць мы іх не навучылі, пра што шкадую. Цяперашняя Беларусь дзецям спадабалася.

Мы таксама ў захапленні, гэта ўжо цалкам еўрапейская дзяржава. Я лічу, што многае робіцца для чалавека. У 90-92-м было ўсё такое шэрае і безнадзейнае. Цяпер шыкоўныя дарогі, добраўпарадкаваныя гарады, сучасныя гандлёвыя цэнтры, добрыя прадукты. А на якіх машынах людзі ездзяць! Зноў ходзяць на канцэрты! Я і ў Беларусі выступаю, і ў Расіі ёсць работа.

І ведаеце, адчуваю сябе пестуном лёсу: у мяне выдатная сям'я — гэта самыя блізкія, самыя родныя, самыя надзейныя людзі. Я працаваў ва ўнікальным калектыве — «Песняром» у верасні споўнілася 50 гадоў, а мы пасюль спяваем!

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з асабістага архіва сям'і КАШАПАРАВЫХ.

Ірына ЯРОМКІНА:

«ЖАДАННЕ СТВАРАЦЬ МНЕ ДОРАЦЬ ДЗЕЦІ»

ГЭТАЯ балерына разбівае ўшчэнт ўсе стэрэатыпы. У яе — такой вытанчанай, далікатнай, палётнай — неверагодна моцны характар. Яна — мама траіх дзяцей, але для яе ніколі не стаяла дылема: сям'я ці прафесія. Нават калі яе паставяць перад такім выбарам, яна, ні хвіліны не вагаючыся, выбера дзяцей. І як добра, што ёй не даводзіцца рабіць такіх рашучых крокаў!

Практычна кожны вечар яна ззяе на сцэне, зноў і зноў скараючы сваім талентам гледачоў. Сёння госця «Алесі» — прыма-балерына Вялікага тэатра Беларусі Ірына ЯРОМКІНА.

— На сцэне вы ўвасабляеце самыя розныя вобразы, партыі, характары... Што дорыць вам натхненне?

— Пасля некаторых спектакляў здаецца, што табе ўжо нічога не хочацца, таму што ты цалкам выклаўся на сцэне, вывернуў самога сябе навыварат. Але я ведаю, што за межамі тэатра мяне чакае іншае жыццё. Так, жаданне ствараць дораць кнігі і музыка. Але самыя галоўныя мае натхняльнікі — мае дзеці! Калі мы разам, мы з дзяўчынкамі размаўляем, займаемся хатнімі справамі, гуляем, радуемся, смяёмся — і гэтая атмасфера дзіцячай наіўнасці і бязмернай любові мяне неверагодна напаўняе. І я гатовая ствараць далей!

— Ці хацелі б, каб дачкі прадоўжылі дынастыю артыстаў балета?

— Цяпер назіраю за сваімі дочкамі, гляджу, як яны развіваюцца, у чым кожная праяўляе сваю індывідуальнасць, характар і часам думаю: не патрэбны ім гэты балет... Хоць усе даныя ў дзяўчынак у наяўнасці і абедзве ў адзін голас заяўляюць, што абавязкова будуць балерынамі. Адна насок цягне, за ёй — другая, і абедзве крычаць: «Мама, паглядзі, як мы ножку падняліі!» А я думаю: ці трэба ім гэта?

— Чаму?

— Напэўна, я асцерагаюся, каб ім у галаве не засеў стэрэатып аб мадэльнай знешнасці, які цяпер асабліва навязвае грамадства. З дзецьмі пра іх фізічную форму трэба гаварыць вельмі акуратна, каб не траўміраваць іх псіхіку і не сфарміраваць няправільныя паняцці. У харэаграфічным вучылішчы я была пухленькая. «Таму што з Пухавіч», — жартавала настаўніца. Хоць цяпер гляджу на свае фатаграфіі — худзенькая дзяўчынка. Але я залішне адказна паставілася да сваёй знешнасці, стала сачыць за фігурай і лічыць калорыі. Быў выпадак, калі мужчына перада мной нёс кардонную каробку, а я шукала, дзе на ёй напісана каларыйнасць прадукцыі, але гэта аказалася каробка... з-пад тэлевізара.

Не хацелася б, каб праз гэта праходзілі мае дзеці. Цяпер у мяне засталася звычка есці мала. У нас у сям'і няма забароны на булкі ці макароны. Але дочкі ведаюць, што ў мучным шмат калорый, а калі не хочаш есці, то запіхваць у сябе ежу не варта. Магчыма, гэта будзе ім толькі плюсам у далейшым жыцці. Сын Максім быў у дзяцінстве досыць мажным дзіцем, цяпер ён выцягнуўся, у яго прыгожыя балетныя ногі. Нават жартую часам: можа, дарма не аддала цябе ў балет? *(Усміхаецца.)* А дочкам кажу: «Пакуль займайцеся ўсім, што падабаецца, а там паглядзім...»

— Вы не раз казалі, што, калі ў вас з'явіўся першынец Максім, думалі, што будзеце аддаваць сябе ўсю сыну, а не прафесіі...

— Але ёсць лёсавызначальныя рэчы, ад якіх не ўцячэш. Балет стаў важнай часткай майго жыцця менавіта калі з'явіўся сын. І пачаўся мой творчы ўзлёт, кар'ерны рост, галоўныя партыі. Памятаю, адной з першых сур'ёзных роляў стала Маша ў «Шчаўкунку» Пятра Чайкоўскага. У самым пачатку спектакля яна бяжыць насустрач свайму дзядзьку з тварам, які зіхаціць ад радасці, ад прадчування чарадзейства, цуду. Для таго каб настроіць сябе эмацыянальна, заўсёды перад гэтай сцэнай уяўляла, што ў глядзельнай зале сядзіць мой сын і глядзіць на мяне. І тады ў мяне з'яўлялася тая самая ўсмешка, якая была так неабходная для вобразу Машы... Максім — мой памочнік ва ўсім. Цяпер сын атрымлівае прафесію інжынера ў БДАТУ. Часам гляджу на 19-гадовага сур'ёзнага Максіма і ўспамінаю, як люляла яго на руках. Цяпер на руках ён носіць мяне...

— У пачатку гэтага года вы атрымалі званне народнай артысткі Беларусі. Што для вас значыць гэтая ўзнагарода?

— Любую ўзнагароду ўспрымаю як падзяку за нашу працу. Безумоўна, радасна, што адзначылі, спадзяюся, што заслужана. Любое званне — гэта рух наперад, творчы рост, своеасаблівы стымул і крыніца натхнення. А народны артыст — настолькі высокае прызнанне, што да яго можна ставіцца выключна з павагай. І калі за мяне шчыра радуюцца — вельмі прыемна. Наша прафесія патрабуе неверагодных фізічных сіл, канцэнтрацыі ўвагі, эмацыянальнай аддачы. Артысты балета не выходзяць на сцэну з думкай пра грошы за выступленне — выходзяць дзеля творчасці, у якую я заўсёды ўкладваю душу.

— Ці існуюць цяпер спектаклі, у якіх вы можаце расплакацца проста на сцэне?

— У нашым рэпертуары засталіся два спектаклі, у якіх не магу стрымаць слёз. Першы — балет «Страсці (Рагнеда)». Калі перад вачыма дубцамі б'юць дзіця — ком да горла падступае кожны раз і проста градам цякуць слёзы. Нічога не магу з сабой зрабіць... І самая першая сцэна балета «Анюта» вельмі цяжкая для мяне — тая, у якой хаваюць маму гераіні. Мне здаецца, гэта катастрофа ўсяго жыцця!

У балеце «Рамэа і Джульета» ўжо не плачу, уваходжу ў вобраз літаральна за некалькі секунд, як па пстрычцы, усведамляю ўсю трагедыю таго, што адбываецца... Але партыя Джульеты неверагодна складаная: у ёй сабрана практычна ўсё. Як і ў вобразе Кармэн у балеце Бізэ — Шчадрына, у якім усе крайнія эмоцыі жывуць у адзіным акце. Гэтыя 50 хвілін здаюцца паўнавартасным трохактным спектаклем! Пастаноўка Валянціна Елізар'ева спусташае цябе цалкам. Менавіта галоўная жаночая партыя ў «Кармэн-сюіце» варта ўсіх прэмій і ўзнагарод. Але і пра «Анастасію» не магу не сказаць. Юрый Траян «намаляваў» тут зусім іншую жанчыну — маці, жонку, абаронцу горада. І сіла гэтага вобраза неверагодная!

— Ці працуецца з Елізар'евым па-іншаму сёння, калі прайшла пэўная колькасць гадоў?

— У маладосці я вельмі баялася Елізар'ева — сумненне ў яго поглядзе выклікала ўва мне паніку. Пачынаўся мандраж, які не магла перамагчы. Цяпер з Валянцінам Мікалаевічам працуецца зусім па-іншаму: праз столькі гадоў пазнала яго з іншага боку. На апошніх рэпетыцыях «Рамэа і Джульеты» я адчувала яго падтрымку, якая ўсяляла ў мяне абсалютную ўпэўненасць. Не баялася заўваг, спакойна іх прымала — і работа была неверагодна плённая.

Калі ў артыста балета няма сцэнічнага вопыту, існуе нейкая сарамлівасць нешта выказаць асабліва эмацыянальна, баішся памыліцца, перажываеш, што пачуцці, якія цябе захліствающь, могуць няправільна прыняць, што з цябе могуць пасмяяцца. У маладосці ў мяне бывала такое.

Але цяпер я магу выказваць эмоцыі настолькі моцна, наколькі я гэта адчуваю. Нават калі памыляюся — гэтага не баюся, спакойна прымаю крытыку, нешта мяняю і даю вынік.

Было прыемна, што Елізар'еву спадабалася, як я станцавала яго Джульету: што раблю, як танцую, што адчуваю і як выказваю эмоцыі. Раней да бязмернай павагі да Елізар'ева дадаваўся страх. Цяпер гэта любоў — любоў да Майстра, які маштабна і неардынарна мысліць, развівае балет і дзякуючы якому нараджаюцца гэтыя шэдэўры.

— Пасля 20 гадоў работы артыст балета можа сыходзіць на пенсію. Але і тут вы разбіваеце стэрэатыпы. Сёлета вам споўнілася 40 гадоў, але вы — вядучая балерына тэатра.

— Пашпартны ўзрост для балета не заўсёды паказальны. Для мяне пенсія ў 38 гадоў — гэта стэрэатып накшталт такіх, што балерына, каб быць паспяховай, нічога не есць і не нараджае дзяцей. І ў мінулыя стагоддзі, і цяпер былі і ёсць артысты, у якіх атрымалася захаваць сябе для сцэны — яны выходзілі танцаваць вядучыя партыі і пасля 40 гадоў. Марго Фантэйн, Алесандра Фэры, Мая Плісецкая... Паглядзіце на Ніну Ананіяшвілі. Ёй далёка за 50, а яна не проста выходзіць на сцэну ў тым ці іншым балеце, яна танцуе вельмі складаныя спектаклі, такія як «Лебядзінае возера» і «Шчаўкунок». І пакуль я адчуваю, што годна выходжу на сцэну, я хацела б працягваць гэта рабіць...

Алена БАЛАБАНОВІЧ.
Фота Анжалікі ГРАКОВІЧ.

ЗНАЙДЗІСЯ, ДЗІЦЯ!

Сотні дзяцей у нашай краіне не ведаюць, што такое любоў родных людзей, бо гадуюцца ў дзяржаўных установах — прытулках і дзіцячых дамах. «Знайдзіся, дзіця!» — так мы назвалі праект «Алесі», які ажыццяўляецца пры падтрымцы Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Рэспублікі Беларусь. У жнівеньскім нумары мы знаёмім вас з Ільём і Сярожам, прыязнымі і добрымі хлопчыкамі.

ПРЫСВЯЧЭННЕ КАХАННЮ

Як вядома, каханне — гэта і доўгацярплівасць, і міласэрнасць, і велікадушнасць, жаданне не сябе праслаўляць, не сабой ганарыцца, не сваёй праўды шукаць, а быць разам у час ліха і разам цешыцца з ісціны, усяму верыць, спадзявацца і песціць надзею, бо нават калі прароцтвы спыняцца і галасы змоўкнуць, любоў існаваць не перастане... Ёсць меркаванне, што гэтай біблейскай мудрасцю кіравалася ў сваім жыцці Францішка Уршуля Радзівіл — першая на нашых землях жанчына-драматург, заснавальніца беларускага тэатра. Кажуць, менавіта дзеля настаўлення на правільны шлях свайго шчадралюбнага мужа Уршуля і пачала пісаць павучальныя п'есы аб вернасці і каханні. На старонках часопіса «Алеся» вы знойдзеце аповед пра жыццё і творчасць гэтай неверагоднай жанчыны.

АКВАРЫУМ: ПРЫЎНОСІМ ЭКЗОТЫКУ Ў ІНТЭР'ЕР

Акварыум у вашым доме можа стаць прадметам асаблівай гордасці і ўвагі гасцей. Плюсы «кавалачкаў мора» несумненныя: пастаяннае абнаўленне вады ў рэзервуары ўвільгатняе паветра ў пакоі, назіранне за жыццём прыгожых насельнікаў акварыума і мерны плёскат вады ўплываюць як рэлаксанты, настройваючы вас на пазітыўную хвалю. Урачы рэкамендуюць у якасці прафілактыкі павышанага крывянога ціску сачыць за рыбкамі штодзень не менш за 15 хвілін. Як правільна выбраць акварыум? Як лепш размясціць яго ў інтэр'еры кватэры? Якія канструкцыі акварыумаў бываюць? Пра гэта чытайце ў «Алесі».

Ручная работа

Фаміранавы цуд Александрыі Лапуцкай

У яе руках распускаюцца прыгожыя пралескі, яркія дзьмухаўцы, квітнеюць валошкі, макі, ружы, півоні, спеюць сакавітыя ягады, як жывыя выглядаюць рознакаляровыя насякомыя...
Усё гэта з'яўляецца на свет з дапамогай даволі сучаснага дэкаратыўнага матэрыялу — фаамірану (успененай гумы), з якім працуе майстар аўтарскіх брошак і інтэр'ерных кампазіцый Александрыя ЛАПУЦКАЯ.
Мы вырашылі пагутарыць з дзяўчынай пра сакрэты стварэння дэкаратыўных вырабаў, а таксама даведацца, дзе вучаць фом-майстэрству, ці трэба насамрэч станавіцца рамеснікам і чаму яе ўпрыгажэнні карыстаюцца папулярнасцю.

— Раскажыце, калі пачалося ваша захапленне рукадзеллем?

— Яшчэ ў дзяцінстве я любіла маляванне, лепку, была вельмі цікаўным дзіцем. У дарослым узросце ў якасці хобі займалася шыццём, не прафесійна, вядома. Майстравала розныя рэчы: сумкі, спадніцы, лялек. Зыходным пунктам стала мая работа. Падчас студэнцтва падпрацоўвала ў краме тавараў для рукадзелля, там і пачала падрабязна вывучаць і спрабаваць розныя тэхнікі.

— Дзе вы навучаліся гэтаму рамяству?

— Я ніколі не лічыла сябе прафесійным фом-фларыстам. Фаамірану занялася зусім выпадкова. Дома ляжаў пластык, вырашыла паспрабаваць вырабіць з яго прымітыўную ружу. Вынік спадабаўся, хоць тады ён быў далёкі ад ідэалу. Захапілася на нейкі час гэтым заняткам. Сур'ёзна да фаамірану я прыйшла з другой спробы, працавала ў прымітыўных тэхніках (на той момант у інтэрнэце хапала розных майстар-класаў). Пасля адклала амаль на год сваё захапленне.

— Памятаеце сваю першую работу?

— Першы выраб, які да гэтага часу ёсць у мяне ў асартыменце, — чартапалох. Сфатаграфавала і размясціла работу ў свой акаўнт у Instagram. Маім сябрам спадабалася арыгінальная рэч. На той момант я супрацоўнічала з крамай адзення, якая брала на рэалізацыю мае старыя вырабы — ружачкі, заколкі і г. д. Прынесла да іх чартапалох і адну з маіх улюбёных палявых кветак — цыкорый. Казалі, што за іх нават спрачаліся дзве пакупніцы *(смяецца)*. А ў 2017-м спантанна вырашыла паўдзельнічаць у выстаўцы «Млын». У студзені стварыла старонку ў сеціве, запампавала туды першыя работы, і заказы пасыпаліся імгненна. Хоць вырабаў было ўсяго чатыры, праз тыдзень у мяне ўжо былі трывалы старт і падпісчыкі, якія самі прыходзілі на маю старонку без рэкламы.

— У асноўным вашы вырабы прадстаўлены ў выглядзе кветак, лекавых раслін, насякомых, прычым усё вельмі падобнае да арыгінала.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- жилой дом № 11 по ул. Павлины Мядёлки – 17 мес.;
- жилой дом № 1 по ул. Павлины Мядёлки – 16 мес.;
- жилой дом № 3 по ул. Павлины Мядёлки – 13 мес.

Информация о проекте и об объекте строительства

Строительство осуществляется на основании:

- решения Мингорисполкома от 13.12.2018 г. № 5026 «Об изъятии, предоставлении, прекращении существования земельных участков и разрешении строительства»;

- свидетельства (удостоверения) № 500/1799-186 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 17 января 2019 года;

- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданное Инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 28.03.2019 г. № 2-208ЖФ-016/19;

- договора строительного подряда от 31 мая 2019 г. № 12/19, генподрядчик ОАО «Стройтрест № 7»;

- заключения государственной экспертизы на проектную документацию (положительное) от 18.04.2018 г. № 173-15/18.

Начало строительства жилого дома – март 2019 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – декабрь 2020 года.

Характеристика объекта строительства.

Возводимое здание 16-этажного односекционного жилого дома расположено во Фрунзенском районе в микрорайоне Красный Бор-2 в г. Минске на пересечении улиц Лобанка и Мазурова.

Проектным решением предусмотрено возведение 16-этажного односекционного 143-квартирного жилого дома с техническим подпольем и теплым чердаком, повысительной насосной станцией, трансформаторной подстанцией, устройством парковок и автостоянок общей вместимостью 114 м/м, установкой открытых велопарковок общим количеством 77 мест, прокладкой инженерных сетей, благоустройством и озеленением прилегающей территории.

Здание запроектировано в сборном железобетонном каркасе с дисками перекрытия из сборных ригелей, расположенных в продольном направлении здания, многопустотных плит и вертикальными несущими конструкциями из сборных колонн и диафрагм жесткости. Фундаменты свайные забивные.

В жилом доме размещено 143 квартиры: 80 однокомнатных и 63 двухкомнатные квартиры. На первом этаже размещены: помещение товарищества собственников, электрощитовая, помещение уборочного инвентаря.

Высота жилого этажа от пола до пола составляет 2,8 м, в чистоте – 2,52 м. За отметку 0,000 принята отметка пола первого этажа. Высота технического подполья 2,65 м.

В проекте принято два лифта – без машинного помещения грузоподъемностью 1000 кг и 630 кг.

Наружная отделка.

Предусмотрено оштукатуривание фасадов по стеклосетке и окраска фасадными красками.

Окна и балконные двери ПВХ с двухкамерными стеклопакетами. Лоджии имеют остекление в рамах из ПВХ.

Внутренняя отделка.

Покрытие полов – керамическая плитка (лестничные площадки, общие внеквартирные коридоры, лифтовой холл, тамбуры, холл помещения товарищества собственников, помещение уборочного инвентаря, электрощитовая; линолеум на звукоизолирующей подоснове (кабинеты товарищества собственников); бетонные с покраской масляной краской (тепловой узел, водомерный узел, венткамера); цементно-песчаные (лоджии незадымляемой лестницы).

Стены и перегородки – покраска акриловой краской (лестничные клетки, общие внеквартирные коридоры, лифтовой холл, тамбуры, помещение товарищества собственников), облицовка глазурованной керамической плиткой (санузел товарищества собственников, помещения для хранения уборочного инвентаря), окраска масляной краской (электрощитовая).

Потолки – улучшенная окраска акриловой краской (лестничные клетки, общие внеквартирные коридоры, лифтовой холл, тамбуры, помещение товарищества собственников); масляная покраска (электрощитовая, венткамера).

Наружные стены – толщиной 500 мм из керамзитобетонных блоков.

Внутренние перегородки – толщиной 120 мм из керамзитобетонных блоков.

Мероприятия для доступа маломобильных групп населения.

Входные группы.

Для доступа физически ослабленных лиц на кресле-коляске в жилую часть предусмотрено место для установки подъемника.

Поверхности ступеней открытых лестниц входных групп имеют антискользящее покрытие. Наружные лестницы оборудованы поручнями. На марше лестницы, ведущей на крыльцо, выполнены колеи для подъема колясок.

Квартиры.

В прихожих предусмотрены места для установки встроенных шкафов.

В ванных комнатах предусмотрены места для установки стиральных машин.

Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (лоджии с остеклением из ПВХ).

Стены и перегородки между квартирами, между помещениями квартиры и лестничными клетками, холлами, коридорами, вестибюлями:

межквартирные перегородки – толщиной 280 мм: сдвоенная стена из керамзитобетонных блоков.

межквартирные перегородки – бетонные толщиной 160 мм.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, вентиляционные шахты, коридоры, крыша, техподполье, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, трансформаторная подстанция, повысительная насосная станция, инженерно-транспортная инфраструктура (светофорный объект ул. Лобанка – ул. Мазурова).

Строительство Объекта будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами создания объектов долевого строительства (далее – договоры). Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Гражданам для заключения договоров предлагается 81 квартира, из них:

31 однокомнатная квартира общей площадью 34,68 м². Стоимость строительства 1 м² общей площади квартиры составляет 1400 (тысяча четыреста) долларов США.

15 однокомнатных квартир общей площадью 48,17 м². Стоимость строительства 1 м² общей площади квартиры составляет 1300 (тысяча триста) долларов США.

35 двухкомнатных квартир общей площадью от 59,92 до 61,32 м². Стоимость строительства 1 м² общей площади квартиры составляет 1250 (тысяча двести пятьдесят) долларов США.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

Оплата первоначального взноса в размере 30 % от цены договора осуществляется в течение 5 (пяти) банковских дней со дня регистрации в Мингорисполкоме договора создания объектов долевого строительства. Остальные выплаты по договору осуществляются ежемесячно в соответствии с графиком платежей.

Строительство осуществляется согласно Указу Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 206а (тел. +375-17-321-23-84).

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 206а, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а (понедельник–четверг – 8.30–17.45, обед 13.00–14.00, пятница – 8.30–16.30, обед 13.00–14.00).

Для подачи заявления необходимо личное присутствие и паспорт гражданина.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение 3 (трех) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и УП «ЗАВОД ЭФФЕКТИВНЫХ ПРОМЫШЛЕННЫХ КОНСТРУКЦИЙ» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

#Яжмаці!

РАМОНКІ І ЖУК,

ці Кожнаму сваё

Летась мы пераехалі ў новую кватэру. Вядома, для нашай сям'і гэта была вялікая радасць, мы ўсе былі паглынутыя ўладкаваннем апартаментаў і адаптацыяй на новым месцы.

А сёлета я раптам выявіла, што газоны пры падыходзе да нашага дома проста абсыпаныя рамонкамі. Кожны дзень праходзіла міма кветак і атрымлівала асалоду ад гэтай прыгажосці. Але аднойчы, вяртаючыся з работы, убачыла, што мае рамонкі скасілі. Пакамечаныя кветкі, праляжаўшы дзень на спякоце, ужо завялі і былі ўжо нікуды не вартыя. Раптам позірк упаў на аддаленае месца, дзе рамонкі яшчэ не паспелі пакасіць. Я заспяшалася дадому, каб узяць нажніцы і нарэзаць кветак.

Ужо трымаючы ў руках букет рамонкаў, адчувала сябе шчаслівай. Уяўляла, як з раніцы за кубачкам кавы буду глядзець на гэтыя «маленькія сонейкі» і здзіўляцца іх пяшчотнай прастаце.

Дома ў ваннай абліла кветкі вадой і паставіла ў вазу на кухні. За вячэрай дзеці захапляліся рамонкамі і весела пазіралі адно на аднаго з-за букета.

Перад сном Воля забегла ў ванны пакой і адразу ж закрычала абураным голасам:

— Маааам, у нас тут жук! Я мыцца не буду!

Пакуль я дабралася да яе, каб вырашыць праблему, побач з Воляй ужо стаялі дзесяцігадовы сын Мірон і трохгадовая дачка Мелані.

— Мама, глядзі, там чорны жук! — паказала Мялаша.

Насякомае ляжала на дне ванны на спіне і не рухалася.

— Ён мёртвы, фууу, — грэбліва сказала Воля.

— Ты ж не баішся жукоў, — яхідна заўважыў Мірон.

— Гэта я жывых не баюся, а мёртвых — баюся, — парыравала Воля. — Мам, навошта ты жука забіла?

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— Ды не чапала я яго, — паспрабавала апраўдацца я. — Магчыма, ён вываліўся з кветак, калі я іх аблівала вадой.

— Мам, труп трэба прыбраць, — звярнуўся да мяне Мірон.

Я разагнала мітынг і паклала жука ў папяровую сурвэтку. Мялаша не адыходзіла ад мяне. Яе нібыта загіпнатызавала гэтае насякомае. Пахавалі казурку бясслаўна — проста кінулі ў сметніцу. Неўзабаве ў кватэры стала ціха. Дзеці ўлягліся спаць, і я разам з імі.

Праз дваццаць хвілін хатняга спакою пстрыкнуў дзвярны замок і ў хату зайшоў муж Саша. Ён, калі спазняецца да «адбою», стараецца заходзіць у кватэру ціха. Але яшчэ ніколі ў яго гэта не атрымалася. Па-першае, таму, што яго сустракае наш сабака. Бім стараецца не гаўкаць — толькі ледзь скавыча і танчыць перад гаспадаром, але гэта ўсё роўна нейкая гучная дзея. Па-другое, мой чалавек сам па сабе не маленькі, такіх сярэдніх памераў вікінг, і таму ў яго не атрымліваецца лёгкая паходка.

— Мама, мама, мама, — пачула я ціхі шэпт з суседняга ложка.

— Мялаша, спі, — строга звярнулася я да дачкі.

— Ну маааам! Я хачу з татам пагаварыць...

—Толькі хуценька, — згадзілася я і паклікала мужа.

— Не спіце яшчэ? — адкрыўшы дзверы ў пакой, здзівіўся ён.

— Тата, татачка, я хачу сказаць... — забалбатала малая.

Саша зайшоў у пакой і сеў на край маленькага ложка. Дачка тут жа абвіла маленькімі ручкамі шыю таты і пацалавала. У такія моманты, дакладна ведаю, у мужа можна выпрасіць усё што заўгодна.

— Тата, у нас быў жук! — нібыта пра нешта надзвычай важнае паведаміла Мялаша.

— Які яшчэ жук? — спалохаўшыся, спытаў муж.

У нас дома жывуць два каты і сабака. Яшчэ аднаго гадаванца сямейны бюджэт проста не вытрымае, падумаў, напэўна, ён.

— Чоооорны! Вось такі, — Малання ўпала на падушку, закінула рукі ўверх і смешна растапырыла пальчыкі.

Мы засмяяліся.

— Я назбірала букет рамонкаў каля нашага дома, а адтуль выпаў мёртвы жук, — патлумачыла я.

— Нічога сабе, — звярнуўся Саша да малой. — Ты не спалохалася?

— Не-а, мама кінула яго ў сметніцу.

— А што за свята, чаму рамонкі? — спытаў муж.

— Проста так! Хацелася кветак і добрага настрою.

— Ааа! А паесці што ёсць?

— Там суп у халадзільніку...

Муж заспяшаўся на кухню і ўжо амаль каля дзвярэй пакоя буркнуў: «Гм... Рамонкі! І як гэта я сам не дадумаўся... Галоўнае — задарма!»

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Нататкі таткі

☺ ☺ ☺

Старэйшая дачка пасля сняданку:

— Тата, можна з'есці сырок?

— Можна.

Сын:

— Разумныя людзі спачатку ядуць, а потым пытаюцца.

Я:

— А пытацца тады навошта?

— Ну, калі табе дазволяць, значыць, ты ўсё правільна зрабіў.

— А калі не дазволяць?

— Тады будзе не так крыўдна, таму што ты ўсё роўна яго ўжо з'еў.

Вось з якімі каварнымі асобамі даводзіцца жыць пад адным дахам!

☺ ☺ ☺

Двайняткі прывялі малодшую сястру:

— Тата, мы навучылі Ксенію паўтараць гукі жывёл.

Я:

— Праўда? Ксенія, як кажа кароўка?

— Му.

— А гусь?

— Га.

— А конік?

— І-го-го.

Ускладняю задачу:

— А як кажа тата?

Ксенія (ўпэўнена):

— Бе.

Ну што я магу сказаць? Падобна, што і сапраўды навучылі.

☺ ☺ ☺

Днямі старэйшая дачка мяне павесяліла:

— Тата, а што гэта за Алеся, з якой ты ў маладосці перапісваўся?

— Адкуль ты гэта ўзяла?

— У цябе ў кніжцы напісана.

— А, проста знаёмая.

— А мама ведае?

Я, абурана:

— Я не разумею такіх пытанняў, можа, ведае, можа, не. У чым праблема?

Дачка, строгім голасам:

— Ты, татачка, думай, што ў кніжках пішаш.

P. S. Хвалюецца за татачку! :)

☺ ☺ ☺

Поля:

— Тата, ты толькі не палохайся, але ты нам з Верай вінен дзесяць рублёў.

— Нешта я не згадаю, каб я ў вас пазычаў грошы.

— Нам мама вінна дзесяць рублёў.

— Калі мама вінна, мама хай і аддае. Я пры чым?

— Проста ў яе цяпер няма, і яна сказала, каб мы папрасілі ў цябе.

— Можаце перадаць маме, што вы папрасілі.

— Тата?

Аддаў, вядома, куды я падзенуся.

Праўда, неўзабаве высветлілася, што жонка ў іх брала не дзесяць рублёў, а восем, і адкуль узяліся яшчэ два рублі, не зусім зразумела. Мабыць, гэта камісія за банкаўскія паслугі.

Вы спытаеце, чаму такая велізарная камісія? Тут якраз усё проста: у двайнятак — падвойная такса.

P. S. Таму танней пазычаць грошы ў адзіночных дзяцей.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СЕЗОН НАРЫХТОВАК

Баклажаны на зіму

Спатрэбіцца: *перац горкі — 3 шт., баклажаны — 2,5 кг, морква — 1 шт., кроп — 1 пучок, часнок — 3 шт., гарчыца ў зярнятах (сухая) — 1 ч. л., чырвоны молаты перац — 0,5 ч. л., чорны молаты перац — 0,5 ч. л.* ***Для марынаду:*** *алей — 300 мл, вада — 0,5 л, воцат 9 % — 100 мл, соль — 2 ст. л, цукар — 100 г, 2 лаўровыя лісты.*



Баклажаны вымыць і нарэзаць кубікамі, добра пасаліць, пакінуць на гадзіну, каб далі сок. Потым прамыць і адціснуць ад лішняй вадкасці. Моркву надзерці на тарцы для карэйскай морквы. Марынад давесці да кіпення, пакласці ў яго баклажаны і моркву. Хай усё варыцца на невялікім агні 20 хвілін. За пару хвілін да заканчэння варкі дадаць здробнены часнок, гарчыцу, дробна нарэзаны кроп, перац. Даць закіпець — і можна раскладваць па чыстых стэрылізаваных слоіках. Адразу закатаць і ўхутаць слоікі коўдрай да поўнага астывання. Выхад — 5 слоічкаў па 0,5 літра.

Адкрываць такія баклажаны не раней, чым праз два месяцы. Захоўваць можна пры пакаёвай тэмпературы.

ПАКАШТУЙЦЕ!

Французскі яблычны пірог

Спатрэбіцца. Для пясочнай асновы: *мука — 250 г, масла — 130 г, вада — каля 50 мл. Для начынкі: яблыкі — 4 шт., мёд — 2 ст. л., масла — 20 г, 2 галінкі размарыну.* ***Для ўпрыгожвання:*** *2 чырвоныя яблыкі, цукар, цукровая пудра, масла. Форма для адкрытых пірагоў дыяметрам 28 см.*

Замясіць цеста. Старанна змяшаць муку з маслам, дадаўшы зусім трохі вады. Цеста скатаць у шар, загарнуць яго ў харчовую плёнку і прыбраць у халадзільнік.

Праз гадзіну дастаць цеста з халадзільніка. Раскачаць у тонкі пласт і вылажыць у форму для адкрытых пірагоў. Накалоць цеста па ўсёй плошчы відэльцам.

Накрыць аснову для пірага пякарскай паперай (або фольгай) і выкласці фасолю (гарох або іншыя «ўцяжарвальнікі»). Выпякаць у разагрэтай да 180 °С духоўцы 15 хвілін.

Тым часам яблыкі ачысціць ад лупіны, нарэзаць адвольнымі кавалачкамі і выкласці ў патэльню разам з маслам і мёдам. Дробна пасекчы размарын і таксама дадаць да яблыкаў. Тушыць 10 хвілін. Затым перакласці яблыкі ў блендар і ўзбіць да стану пюрэ.

Вылажыць яблычнае пюрэ ў падрыхтаваную аснову.

Два чырвоныя яблыкі, не чысцячы лупіны (выдаліць толькі асяродак з костачкамі), нарэзаць тонкімі долькамі і выкласці іх па крузе на паверхні пірага.

Растапіць трохі масла і намазаць пэндзлікам паверхню пірага. Зверху трохі прысыпаць цукрам і паставіць выпякацца пры 180 °С на 25—30 хвілін.

Як толькі пірог будзе гатовы, дастаць яго з духоўкі і ўключыць яе на максімум з функцыяй «грыль», калі яна ёсць. Пірог між тым прысыпаць злёгку цукровай пудрай і паставіць у духоўку яшчэ на 2 хвіліны.

Махшы — галубцы па-егіпецку

Яны падобныя на нашы галубцы. Прынцып прыгатавання практычна той самы: у ліст капусты заварочваюць начынку, а затым тушаць у соусе. Розніца ў тым, што егіпецкія галубцы куды меншыя і танчэйшыя. Але галоўнае адрозненне ў начынцы!

Яе аснова — круглазерневы рыс, шчодра прыпраўлены спецыямі. Другі галоўны кампанент — свежае зяленіва ў любой камбінацыі і прапорцыях. Звычайна дадаюць пятрушку, кроп, кінзу, базілік, мяту, арэгана — чым больш, тым лепш. Трэці інгрэдыент — салодкія мясістыя памідоры!

Спатрэбіцца: *качан капусты вагой каля 1 кг, шклянка рысу, 50 г алею, па невялікім пучку зяленіва, памідоры — 3-4 шт., цыбуля — 2 шт., часнок — 2-3 зубкі, 1,5 літра булёну (мяснога ці з гародніны), таматны соус — 2 ст. л., соль — на смак.*

Качан капусты падзяліце на лісты як для звычайных галубцоў і нарэжце іх кавалкамі. Занадта грубыя жылкі зрэжце, але не выкідвайце.

Для начынкі старанна прамыйце рыс, дадайце ўсе спецыі і змяшайце. Зяленіва дробна нарэжце, часнок прапусціце праз прэс, дадайце да рысу. Тоўстыя сцеблы ад зяленіва захавайце — яны спатрэбяцца для варкі галубцоў. Памідоры з цыбуляй нарэжце як мага драбней і таксама дадайце ў начынку. Асобна ў кубку змяшайце таматную пасту са 100 мл вады, уліце да рысу, туды ж уліце алей. Старанна змяшайце начынку.

Сфарміруйце галубцы. Дно таўстасценнай каструлі высцеліце сцебламі зяленіва і зрэзанымі капуснымі жылкамі, каб махшы ў працэсе тушэння не падгарэлі. Выкладзіце іх ушчыльную ў каструлі пластамі. Заліце булёнам і тушыце пасля закіпання на мінімальным агні 1-1,5 гадзіны.

ХОЦЬ У БУДАНЕ ЖЫЦЬ, АБЫ З КАХАНЫМ БЫЦЬ (Беларуская народная прымаўка)

Конкурс апавяданняў «Звязды»: падводзім вынікі...

Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кожны з суддзяў вызначыў сваю тройку лідараў (зрэшты, у кагосьці гэта была чацвёрка і нават пяцёрка). З сумы гэтых меркаванняў і склалася агульная карціна. Адразу скажам, што адно імя фігуравала першым ва ўсіх спісах: **Маргарыта Латышкевіч** стала безумоўным пераможцам конкурсу апавяданняў «Звязды», з чым мы яе шчыра віншуем! І справа не ў тым, што малады празаік ужо мае ў скарбонцы дасягненняў Нацыянальную літаратурную прэмію 2017 года ў намінацыі «Дэбют», — проста паміж радкоў твора бачна, што аўтар улюбёная ў фальклор (перадусім беларускі — яго Маргарыта даследуе ў навуковай лабараторыі філфака БДУ, дзе таксама глыбока вывучае міфалогію і фантастыказнаўства) і мае безумоўны талент апавядальніка, магчыма, узяты ў спадчыну ад бацькі, а мо і выкрышталізаваны самастойна праз пошук «сваёй» формы: ад вершаў да апавяданняў, фэнтэзійных аповесцяў — і, ходзяць чуткі, ужо недалёка да вялікага рамана.

Калі нехта прапусціў яе конкурсную **«Казку пра ваўка»** — адкрыйце нумар за 1 верасня мінулага года, нетаропка прачытайце, паглыбіўшыся ў крыху змрочную містычную атмасферу... і прызнайцеся, ці не пабеглі пасля апошніх слоў ледзь заўважныя мурашкі па спіне?

Другое месца атрымаў **Віктар Варанец** з апавяданнем **«Апошні форт»**, настолькі дэталёва дакладным і рэалістычным, што амаль не сумняваешся: гэтая гісторыя сапраўды здарылася падчас Вялікай Айчыннай вайны і выпадкова стала вядомая пісьменніку. «Фактычна ўсё жыццё Віктара Варанца звязана з Гродзеншчынай. У самім Гродне ён у 1962 годзе нарадзіўся, у 1985-м скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, атрымаўшы дыплом філолага і накіраванне на працу ў адну з сельскіх школ непадалёк ад роднага горада. Пасля выкладаў беларускую мову ў абласной гімназіі № 1. І вось ужо больш за дваццаць пяць гадоў займаецца выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, — так прадставіў аўтара Алесь Бадак у сваёй прадмове. — А ў вольны час піша: пачынаў з вершаў, але апошнім часам аддае перавагу прозе. Прычым, па прызнанні самога аўтара, усе яго творы так ці інакш звязаныя з роднымі мясцінамі. Што ж, яшчэ Фолкнер сцвярджаў, што яго маленькая паштовая марка роднай зямлі вартая таго, каб пісаць пра яе ўсё жыццё. Між тым нарадзіўся славуты пісьменнік у Нью-Олбані штата Місісіпі — горадзе, які значна саступае нашаму Гродна і па плошчы, і па колькасці насельніцтва. Хтосьці запярэчыць, не паддаўшыся на жарт, што такое параўнанне не зусім карэктнае, але, думаю, пагодзіцца ў галоўным: родная зямля, і праўда, самая невычэрпная крыніца натхнення». А яшчэ — ці ведалі вы? — Віктар Іванавіч не толькі кіраўнік літаратурнага клуба «Катарсіс» Гродзенскага медуніверсітэта, але і распрацоўшчык беларускай медыцынскай тэрміналогіі, які склаў для ўрачоў дапаможнік па прафесійнай лексіцы.

Віктар ВАРАНЕЦ.

На трэцім радку часцей за ўсіх суддзі згадвалі **Дзмітрыя Шулюка,** чыё вельмі добрае і кранальнае апавяданне **«Як прыходзяць Каляды»** было надрукавана на газетных старонках акурат незадоўга да свята, у снежні 2018-га, і стварыла сапраўдны казачны настрой. Што яшчэ варта ведаць пра маладога аўтара? Цытуем вядучага конкурсу: «Дзмітрый Шулюк нарадзіўся ў 1989 годзе на Смаргоншчыне. Пасля заканчэння Рэчыцкага дзяржаўнага педагагічнага каледжа працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Жаданне атрымаць вышэйшую адукацыю прывяло яго на завочнае аддзяленне Белдзяржуніверсітэта. Праўда, не на філалагічны факультэт, як звычайна бывае з тымі, хто вырашыў звязаць сваю прафесію з мовай і літаратурай, а на філасофскі. ...Зрэшты, думаецца, гэта зусім не лішні досвед у творчасці, бо ў выніку і нараджаюцца такія фразы, як, напрыклад, у адным з падарожных эсэ маладога празаіка: «Аўтару неверагодна шмат прыходзіцца рабіць, каб быць героем, але каб герой не быў аўтарам».

Усім без выключэння аўтарам, якія даслалі свае работы, дзякуем за праяўлены інтарэс, неабыякавасць і бязмежнасць фантазіі — і няхай кожны напісаны радок набліжае вас да вяршынь майстэрства! Віншуем пераможцаў і ў хуткім часе запросім усіх у рэдакцыю для правядзення цырымоніі ўзнагароджання.

ПРОСТА ПІСАЦЬ СКЛАДАНА...

Літаральна сёння бярэ старт чарговы конкурс апавяданняў «Звязды», творчае шэфства над якім працягне вопытны вядучы — пісьменнік, паэт-песеннік, публіцыст, літаратурны крытык, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак. Але перад тым, як адкрыць новы год творчага праекта, мы вырашылі даць своеасаблівую падказку патэнцыйным яго ўдзельнікам — тым, хто, магчыма, сумняваецца, ці варта паспрабаваць свае сілы. Якіх жа аўтараў хацелася б знайсці ў сезоне 2019/20?

— Алесь Мікалаевіч, якія творы асабіста вам хацелася б убачыць на конкурсе?

— Справа ў тым, што ў літаратурнага конкурсу газеты «Звязда» няма такіх спецыфічных умоў, што гэты чалавек можа ўдзельнічаць, а гэты не можа, бо ён прафесіянал (ці наадварот: таму што непрафесійны аўтар) — гэта конкурс для ўсіх, у тым яго адметнасць. Але мне асабіста хацелася б адкрываць кожны год новыя яркія імёны. Хоць заўсёды, канешне, прыемна, калі ў конкурсе ўдзельнічаюць вядомыя празаікі — яны падымаюць конкурсную планку і падцягваюць іншых канкурсантаў. Але, паўтаруся, заўсёды цікава, калі дасылаюць творы людзі для мяне незнаёмыя ці малазнаёмыя — новыя імёны ў літаратуры.

Дзмітрый ШУЛЮК.

Адкрыццё новых аўтараў, на мой погляд, — адна з самых важных задач конкурсу. У тым і яго складанасць, бо жанр апавядання — адзін з самых няпростых у літаратуры, асабліва калі ўлічыць, што апавяданне можа быць аб'ёмам і дзесяць, і дваццаць старонак, а ў нашым выпадку яго памер строга абмежаваны аб'ёмам газетнай паласы. І вельмі цяжка бывае адмаўляць аўтару, калі яго апавяданне ў два разы большае, бо прымусова скарачаць яго — значыць нешта губляць, дый для аўтара скараціць гатовы твор надзвычай складана. А кароткія апавяданні, такія, як пісаў Чэхаў, — гэта сапраўды вышыні майстэрства, тая планка, да якой далёка не кожны дацягнецца.

Наш конкурс існуе ўжо шмат гадоў, і кожны год у ім з'яўляюцца новыя аўтары. Вельмі прыемна, калі прыходзяць маладыя пісьменнікі, бо яны нясуць нейкую свежасць і навізну, за якой хочацца разгледзець будучыню нашай прозы, літаратуры наогул. Мяне радуе, што ў маладых добрая беларуская мова, што яны разняволеныя ў выбары кірунку — могуць быць і традыцыяналістамі, і наватарамі, могуць сумяшчаць у адным творы імкненне да інтэлектуальнай прозы і элементы містыкі ці дэтэктыва... Выходзіць такі вінегрэт, які робіцца добрай гаспадыняй толькі на вялікія святы. Спадзяюся, для моладзі ўдзел у «звяздоўскім» конкурсе апавяданняў — менавіта такое свята, да якога яны прапануюць найлепшы творчы празаічны вінегрэт, які чытача вельмі ўсцешвае. Але гэта не сведчыць пра тое, што стаўку мы робім толькі на маладых. Бывае вельмі цікава атрымліваць і творы ад людзей сталых, у якіх багаты жыццёвы вопыт і якія прапануюць так званы нон-фікшн на мяжы літаратуры і дакументалістыкі, апавядаючы пра гісторыі, якія яны перажылі. Цікава чытаць апавяданні аўтараў, якія жывуць у глыбінцы і ведаюць яе знутры, не па ўласных фантазіях ці ўспамінах свайго далёкага дзяцінства, а насамрэч жывуць гэтым штодня, — расказваць такія гісторыі цікава як ім самім, так, мяркую, і чытачам «Звязды». Бо чытачы «Звязды» — не толькі Мінск, абласныя і раённыя цэнтры, але і вёсачкі, большыя і меншыя, пра якія гавораць у сваіх творах іх землякі. Падобныя творы, я спадзяюся, таксама будуць з'яўляцца на конкурсе.

УВАГА! КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА!

Абыдземся без фанфар і барабанаў, шаноўнае спадарства, — тым больш, некаторыя актыўныя аўтары, хто сочыць за літаратурным конкурсам «Звязды», ужо даслалі свае работы ў новы сезон. А для будучых удзельнікаў, якія пакуль у творчым працэсе, нагадаем самыя важныя ўмовы:

— прымаюцца апавяданні на беларускай мове, якія раней нідзе не друкаваліся;

— разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара;

— памер дасланага твора не павінен перавышаць 5 старонак (10—12 тысяч знакаў)!

Рэдакцыя пакідае за сабой права не рэцэнзаваць і не вяртаць творы.

Апавяданні, а таксама некалькі слоў пра сябе і асабістыя звесткі (сапраўдныя прозвішча і імя, дакладны паштовы адрас, кантактны тэлефон і поўныя пашпартныя даныя — нумар, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар) накіроўвайце на адрас: **газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013,** з пазнакай «На літаратурны конкурс». Тэксты таксама прымаюцца ў электронным выглядзе на info@zviazda.by таксама з пазнакай «На літаратурны конкурс».

НАПАМІН ДЛЯ БУДУЧЫНІ

У Міністэрстве інфармацыі краіны адбылася рабочая сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь спадаром Фігера Хуанам Вальдэсам.

Размова ішла пра надзённыя пытанні ў арганізацыі беларуска-кубінскіх медыйных адносін у справе пашырэння ведаў пра сучасную Кубу ў Беларусі і наадварот — пра сённяшняе сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў СМІ Кубы. З беларускага боку прагучаў шэраг актуальных прапаноў — некаторыя з іх агучыў міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч. Звернута ўвага на неабходнасць падпісання пагаднення паміж дзвюма краінамі ў галіне супрацоўніцтва ў сферы інфармацыі. Таксама запланаваны «кубінскі выпуск» часопіса «Беларусь». Размова ішла таксама пра правядзенне прэс-тураў кубінскіх журналістаў у Беларусі і беларускіх — на Востраве Свабоды.

Удзельнікі рабочай сустрэчы нагадалі пра існуючыя традыцыі кубінска-беларускіх гуманітарных, культурных і літаратурных стасункаў. Гучалі імёны кубінскіх пісьменнікаў, творы якіх беларускія калегі перакладалі ў ранейшыя дзесяцігоддзі на сваю родную мову.

Сяргей ШЫЧКО.

Векапомнае

ЯНЫ СТАЯЛІ НАСМЕРЦЬ

Урачыстае мерапрыемства па адкрыцці помніка загінулым падчас вайны чырвонаармейцам адбудзецца заўтра на тэрыторыі вучэбнага цэнтра часцей Мінскага гарнізона «Валоўшчына». Гэта месца перапахавання дзесяці вайскоўцаў, што паклалі свае галовы падчас абароны Мінска ў чэрвені 1941 года.

26—28 чэрвеня 1941 года на подступах да Мінска ў раёне хутара Валоўшчына 64-я і 108-я стралковыя дывізіі вялі цяжкія баі. На іх месцы, дзе раней была прылеглая да навучальнага цэнтра ўнутраных войскаў лесапаласа, у 1960-я гады быў установлены помнік з таблічкай «Невядомаму салдату ад воінаў-чэкістаў». На працягу многіх гадоў вайскоўцы в/ч 5448 даглядалі гэтую магілу.

Дзякуючы камандаванню ўнутраных войскаў і ветэранскай арганізацыі былі высветлены імёны пахаваных у няўлічанай магіле. Пазней помнік быў перанесены на тэрыторыю навучальнага цэнтра. У ходзе правядзення палявых пошукавых работ у чэрвені 2017 года вайскоўцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна вынялі астанкі дзесяці загінулых вайскоўцаў і пяць медальёнаў. 22 чэрвеня мінулага года адбылося ўрачыстае перапахаванне знойдзеных байцоў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ЛОТ 1:
- Капитальное строение, инв. № 400/С-69029 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – блок предочистки), площадью 320,4 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Е;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97343 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 390,0 кв. м, г. Гродно,, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания блока предочистки;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97350 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 12,50 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока предочистки;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97331 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 190,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию предочистки;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97381 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 80,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть к зданию блока предочистки;
- липа (12 единиц)
- шкаф распределительный;
- дерен белый (1 единица)

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 440100000002008245, площадью 0,2180 га (назначение – для обслуживания здания блока предочистки (инв. № 400/С-69029)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Е

Начальная цена продажи – 42 296,34 р. (сорок две тысячи двести девяносто шесть рублей тридцать четыре копейки) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2 115 р. (две тысячи сто пятнадцать рублей).

ЛОТ 2:
- Капитальное строение, инв. № 400/С-89984 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ангар), площадью 449,7 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-69050 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта, наименование – насосная станция), площадью 187,6 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж/1;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97340 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 105,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-58952 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар для воды на 500 куб. м), объемом 500 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97349 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 43,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию насосной станции;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97339 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная дождевая канализация), протяженностью 43,85 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная дождевая сеть к резервуару для воды;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97334 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 24,45 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию автоматической насосной станции;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97386 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 267,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 внутриплощадочная сеть наружного освещения здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97378 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 119,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию автоматической насосной станции;
- тополь (2 единицы);
- каштан (14 единиц)

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 440100000002008244, площадью 0,4859 га (назначение – для обслуживания здания автоматической насосной станции (инв. № 400/С-69050), резервуара для воды на 500 куб. м (инв. № 4660) и здания ангара (инв. № 400/С-89984)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж

Начальная цена продажи – 39 677,04 р. (тридцать девять тысяч шестьсот семьдесят семь рублей четыре копейки) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 984 р. (одна тысяча девятьсот восемьдесят четыре рубля)

ЛОТ 3:
- Капитальное строение, инв. № 400/С-63419 (назначение – здание нежилое, наименование – здание установки контактного выпаривания), площадью 662,4 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Д;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97341 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 165,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания установки контактного выпаривания, резервуара;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-58964 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 250 куб. м пожарно-аварийный водоем), объемом 250 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97347 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 365,10 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию установки контактного выпаривания;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97335 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 22,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию установки контактного выпаривания;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97385 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 103,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения здания установки контактного выпаривания, резервуара;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97382 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 117,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию установки кинтактного выпаривания;
- шкаф распределительный ПР-24-7208;
- липа (4 единицы);
- тополь (2 единицы)

Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 440100000002008243, площадью 0,2356 га (назначение – для обслуживания здания установки контактного выпаривания (инв. № 400/С-63419), резервуара на 250 куб. м ПАВ (инв. № 4702)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Д

Начальная цена продажи – 48 001,63 р. (сорок восемь тысяч один рубль шестьдесят три копейки) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2 400 р. (две тысячи четыреста рублей)

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 4 % от конечной цены продажи объекта. Условия оплаты по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Продавец – РУПП «Гродно,текстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 30 сентября 2019 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 29.11.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.
Последний день приема заявлений – 26 сентября 2019 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ЛОТ 1:
